

НАЙЛЕПШАЯ ШМАТДЗЕТНАЯ СЯМ'Я

ЯК СТАЛЕЛІ Ў АМЕРЫКАНСКІХ 90-Х 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 САКАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 53 (28920)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**36,5 %**

*уведзенага ў студзені — лютым жылля ў краіне пабудавана для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. У студзені — лютым арганізацыі ўсіх формаў уласнасці пабудавалі 4,2 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 480,4 тысячы кв. м агульнай плошчы жылля. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 175,3 тысячы кв. м агульнай плошчы, або 36,5 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 176,2 тысячы кв. м агульнай плошчы жылля, або 36,7 % ад агульнага ўводу па краіне.*



# ЗАХАВАЛЬНІКІ РОДНЫХ ВЫТОКАЎ




Каля вёскі Прасалы Шклоўскага раёна, на беразе невялікай рачулкі, дзе здавён б'юць крынічны струменьчык гаючай вады, з мінулай восені працягваецца творчая, не пабаюся сказаць, эксклюзіўная будоўля. У чым яе сутнасць, арыгінальнасць і незвычайнасць, няцяжка здагадацца. Задума простая — культуралагічны, экалагічны і гістарычны «народны» праект пад назвай «Родная крынічка». Пачынаўся ён звычайна: аднойчы былыя аднавяскоўцы і сябрукі сустрэліся і вырашылі, што ў Год малой радзімы яны зробяць для роднай вёскі падарунак — навядуць адмысловы парадак на мясцовай крыніцы.

Калі мне давялося апынуцца на месцы будоўлі, каля крыніцы працавалі два майстры — вядомы на Магілёўшчыне разьбяр па дрэве Пятро ПЕЧАНЬКОЎ і цяперашні жыхар Шклова, чаканшчык па метале, сталяр і разьбяр Мікалай ПУНЧАНКА. Цікава, што яны абодва закаханыя і ў паэтычную музу — ствараюць вершы і песні.

— У нашай творчай брыгадзе працуюць і іншыя людзі — гэта Аляксандр Ромскі і Леанід Сімановіч, — кажуць Пятро і Мікалай пра сваіх аднавяскоўцаў. А яшчэ расказваюць і пра былога захавальніка крыніцы Рыгора Аладзьева. Менавіта яго — ветэрана вайны, першага пасляваеннага рупліўца вясковай крынічкі, Пятро Печанькоў «увекавечыў» у дрэве, а скульптуру паставілі на ўваходзе ў комплекс — каб усе ведалі, хто такі дзядзька Рыгор.

Сваімі сіламі, на ўласныя грошы, майстры аднаўляюць старажытную крыніцу. Не засталіся без дабрадзейнага ўдзелу і жыхары суседніх вёсак Карзуны, Слабодка, Стараселле, Вышкава, на іх грошы набывалі будаўнічыя матэрыялы. Майстры паспелі ўжо вылажыць нішу для сцёку вады, зрабіць дах над крыніцай, узвесці ўваходнюю браму. Да лета крыніца будзе цалкам уведзена ў строй.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

КОРАТКА

• **Экспазіцыя да 75-годдзя вызвалення Азарыцкіх лагераў смерці адкрылася ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

• Саўмін прызначыў прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання буйнымі ААТ.

• **У Турцыі адкрылі самы вялікі ў Еўропе парк забаў.**



• Рыбакоў, якія добраахвотна здадуць сеткі, вызваляць ад адказнасці.

• **Мінскі метрапалітэн восенню плануе пачаць эксплуатацыю цягніка «Штадлер».**

ISSN 1990 - 763X

Рэха вайны

# «Дзеці ў пясочніцах на касцях гуляць не будуць»

У Брэсце працягваюцца раскопкі на месцы былога гета. Падняты астанкі амаль тысячы чалавек



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Аляксандр РАГАЧУК паказвае старыя будынкі «Прыбужскага квартала».

**У самым цэнтры Брэста, куды прыйшоў інвестар, каб распачаць будаўніцтва квартала сучаснай жылой забудовы, працягваюцца раскопкі. Па стане на мінулы тыдзень ужо паднялі астанкі 990 чалавек. Раскопкі працягваюцца. Не выключаецца, што будзе выяўлена яшчэ адна вялікая магіла. Можа, так лёсу было заўгодна, каб напярэдадні вялікіх юбілейных святкаванняў усё гэта выявілася і рэшткі людзей нарэшце былі пахаваныя па-чалавечы...**

СТАР. 13

Камунальныя стасункі

# Цэтлікавы дзёгаць у пластыкавым мёдзе,

## або Новыя жыцці палімераў і пластмасавая культура як паратунак ад смецця

**Лаўкі, плітка для тратуара, плёнка на цяпліцу, вёдры, смеццевыя кантэйнеры... Усё гэта ў Беларусі выбляецца з выкарыстаннем перапрацаваных палімераў. Аднак падарыць другое жыццё ўсім выкінутым у смецце пластыкавым рэчам, на жаль, немагчыма, бо шмат якія з іх не паддаюцца другаснай апрацоўцы і едуць на звалкі. Замест пошукаў новых шляхоў пазбаўлення ад смецця лепш памяншаць утварэнне адходаў, якія нельга выкарыстаць ізноў, лічаць спецыялісты і раяць, як гэта рабіць.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

СТАР. 4

Заканатворчасць

# ПЕРААДОЛЕЦЬ СТЭРЭАТЫПЫ І БАР'ЕРЫ

## Абмяркоўваецца законапраект, які закране інтарэсы больш як паўмільёна чалавек

**У красавіку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу паступіць праект закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». Ён аб'ядnae ў сабе палажэнні двух дзеючых нарматыўных актаў — «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь» і «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў». Гэта неабходна, каб прывесці беларускае заканадаўства ў адпаведнасць з Канвенцыяй аб правах інвалідаў. Якія навацыі, што непасрэдна закранаюць інтарэсы 568,5 тысячы людзей з інваліднасцю, а таксама іх сем'і прадугледжаны? Разгледзім самыя асноўныя.**

### Супраць дыскрымінацыі

Устанаўліваецца забарона дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці. Закон тлумачыць, што такое прамая і ўскосная дыскрымінацыя, і апісвае выпадкі, якія не падпадаюць пад гэтае паняцце. Напрыклад, абмежаванні, абумоўленыя асаблівымі ўмовамі працы, якія немагчыма змяніць з дапамогай разумнага прыстасавання, не будуць лічыцца дыскрымінацыяй па прыкмеце інваліднасці.

Таксама ў законапраекце з'явіцца шэраг новых тэрмінаў, сярод якіх «абілітацыя», «разумнае прыстасаванне», «універсальны дызайн», «асістыўныя прылады і тэхналогіі», «персанальны асістэнт інваліда», «ясная мова», «аўдыядэскрыпцыя» і іншыя.

### Новаўвядзенні для МРЭК

Прадугледжана фарміраванне міжведамаснай персаніфікаванай базы даных па ўліку інвалідаў, у якую будуць уключаны звесткі аб групе інваліднасці, ступені страты здароўя, прафесійнай або агульнай працаздольнасці, аб абмежаваннях жыццядзейнасці, прычыне, тэрмінах і даце ўстанаўлення інваліднасці, індывідуальных рэабілітацыйных мерапрыемствах. Пра гэта расказала на грамадскім абмеркаванні новага законапраекта, ініцыяваным грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь», **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Дзіяна КАЗАКЕВІЧ.**

Таксама пашыраць пералік асоб, якія могуць прыцягвацца да работы МРЭК. У яго, акрамя медыкаў, уключаць спецыялістаў па сацыяльнай рабоце, прадстаўнікоў камітэтаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне абласных і Мінскага гарвыканкама, упраўленняў мясцовых адміністрацый.

Дарослым, старэйшым за 18 гадоў, якія будуць прызнаныя інвалідамі, будзе ўстаноўлена некалькі груп інваліднасці, дзецям — I—IV ступеняў страты здароўя.

Самі тэрміны ўстанаўлення інваліднасці засталіся ранейшымі, але ўдакладнены крытэрыі ўстанаўлення інваліднасці без указання тэрмінаў пераасведчання. Гэта датычыцца як дарослых, так і дзяцей. Вызначаны ўмовы пераасведчання асоб з інваліднасцю раней устаноўленага тэрміну дзеяння заключэння МРЭК або ў тых выпадках, калі інваліднасць устанаўліваецца без тэрміну пераасведчання. Гэта будзе ажыццяўляцца толькі на падставе заявы чалавека з інваліднасцю або яго законнага прадстаўніка ў пісьмовай форме, якая падаецца ў медустанову.

Уведзены артыкул, які датычыцца рэабілітацыі і абілітацыі інвалідаў і ўключае такія напрамкі, як рэканструкцыйная хірургія, пратэзаванне, артэзаванне, санаторна-курортнае лячэнне, працоўная рэабілітацыя і інш.

Вызначана структура індывідуальных праграм рэабілітацыі асоб з інваліднасцю. Такія праграмы павінны змяшчаць агульныя даныя, інфармацыю аб умовах і характары працы, патрабаванні да арганізацыі спецыяльных умоў для атрымання адукацыі і для працы. Таксама прадугледжана стварэнне цэнтраў рэабілітацыі і абілітацыі людзей з інваліднасцю на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях. Калі няма неабходнасці ўводзіць паўнавартасны цэнтр — іх падраздзяленні могуць стварацца на базе ўстаноў аховы здароўя, адукацыі або сацыяльнага абслугоўвання.

### Адукацыя — інклюзіўная, інфармацыя — даступная

Законапраектам прадугледжваецца забяспечыць для асоб з інваліднасцю інклюзіўную адукацыю на ўсіх узроўнях і навучанне на працягу ўсяго жыцця, даступнасць інфармацыі для людзей з парушэннем зроку і слыху (праз выкарыстанне перакладчыкаў мовы жэстаў, субцітраў, шрыфту Брайля, тактыльнай рэльефнай графікі, асістыўных прылад і тэхналогій), адаптацыю афіцыйных сайтаў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый у інтэрнэце.

Вызначаны канцэптуальныя падыходы да зместу навучальных праграм і стварэння безбар'ернага асяроддзя. Прапануецца ўкараніць паслугу персанальнага асістэнта, якая замацуе ўжо наяўную практыку дапамогі па суправаджэнні, паслугі асабістага перакладчыка мовы жэстаў.

### Права на працу і самарэалізацыю

Нярэдкая праблема — дыскрымінацыя пры прыёме на работу. У Беларусі каля 200 тысяч чалавек з інваліднасцю знаходзяцца ў працаздольным узросце. Крыху больш за палову з іх па стане здароўя могуць працаваць, але на справе маюць работу толькі 56 % ад гэтай колькасці. Каб чалавек мог сябе рэалізаваць, у новым законе прадугледжваюцца механізмы пэўнага «прымусу» арганізацый, каб яны бралі да сябе людзей з інваліднасцю.

Для гэтага прапанаваны кватаванне рабочых месцаў інвалідаў і меры адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правоў гэтай катэгорыі грамадзян, у тым ліку за ўхіленне ад забеспячэння даступнасці аб'ектаў для іх.

Што гэта такое? Прадпрыемству, зыходзячы з колькасці работнікаў, будзе даводзіцца квота на працаўладкаванне людзей з інваліднасцю. «У многіх еўрапейскіх краінах усё большае распаўсюджанне атрымлівае практыка, калі чалавек з абмежаванымі магчымасцямі ўключаецца ў звычайныя працоўныя калектывы. Гэта спрыяе ў тым ліку змене меркавання ў грамадстве ў адносінах да такіх грамадзян», — упэўнены **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.**

Як лічыць **старшыня грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Генадзь ДАВЫДЗЬКА**, сацыялізацыя датычыцца не толькі стварэння пэўнай інфраструктуры, але і пераадолення сацыяльных стэрэатыпаў у грамадскай свядомасці. Гэты законапраект, паводле яго слоў, мае вялікае сацыяльнае значэнне, паколькі накіраваны на тое, каб даць максімальна роўныя магчымасці людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

ЗА і СУПРАЦЬ

# «Інваліды» ці «людзі з інваліднасцю»?

**Пры грамадскім абмеркаванні новага законапраекта значныя дыскусіі выклікала прапанова выкарыстоўваць у нарматыўных прававых актах замест тэрміна «інвалід» — «чалавек з інваліднасцю». Меркаванні раздзяліліся...**

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК:**

— Паколькі дакумент называецца Канвенцыяй аб правах інвалідаў, то мы паўтарылі фармулёўку. Падчас працы над законапраектам мы абмяркоўвалі гэтую тэму з грамадскімі аб'яднаннямі. Слова «інвалід» можа асацыявацца з паняццем недасканаласці, сапраўды трэба, каб азначэнне не несла стыгмы. Але пакуль мы не атрымалі адназначнага адказу.

Па нашай просьбе Міністэрства замежных спраў звярнулася ў структуры ААН па прафесійны каментарый з гэтай нагоды з улікам сусветнай практыкі. Мы запэўнілі нашых сацыяльных партнёраў, што калі нам пацвердзяць неабходнасць выкарыстання тэрміна «людзі з інваліднасцю», то будуць аператыўна ўнесены змены ўжо на этапе разгляду законапраекта. Акрамя таго, наша міністэрства звярнулася ў аналагічныя дзяржаўныя органы Расіі і Украіны, якія таксама выкарыстоўваюць рускамоўны варыянт канвенцыі.

Але, на мой погляд, гэта не першарадная праблема ў пытаннях забеспячэння правоў людзей з інваліднасцю. Галоўнае — забяспечыць іх абарону ў грамадстве ад дыскрымінацыі, і не толькі відавочнай, але і ўскоснай.

**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Таццяна СТАРЫНСКАЯ:**

— Я лічу, самае важнае — гэта што будзе ўнутры закона, наколькі ён дапаможа людзям. Не бачу нічога страшнага ў слове «інвалід». Людзі настолькі прывыклі да яго, што ўсё роўна будуць так называць тых, хто мае інваліднасць. Як, напрыклад, у 1994 годзе аддзелы сацзабеспячэння, або сабесы, перайменавалі ў аддзелы сацыяльнай абароны. Прайшло больш за 20 гадоў, але людзі і сёння завуць іх сабесамі.

Галоўнае, каб закон адбыўся, прайшоў усе стадыі і ўзгадненні і ў далейшым — няўхільна выконваўся.

**Намеснік старшыні Беларускага таварыства інвалідаў Сяргей ДРАЗДОЎСКІ:**

Мы ўсе ведаем, што мова вельмі моцна рэгулюе нашы адносіны. Сацыялогія кажа, што проста называнне чалавека нейкім няправільным чынам прыводзіць да пагаршэння адносін да яго. Параўнайце, напрыклад, словы «чыноўнік» і «чынуша». Таму для нас гэта прынцыповае пытанне.

Практычна ўсе арганізацыі людзей з інваліднасцю ў адзін голас заявілі: давайце памяняем азначэнне «інвалід» на «чалавек з інваліднасцю». Калі гэта на самай справе такое нязначнае пытанне, як кажуць нашы чыноўнікі, дык проста ўлічыце наша меркаванне. Па вялікім рахунку гэта словазлучэнне ўжо прыжылося, стала прымальным пры звароце. Выдатна, давайце замацуем. Мы разумеем, што гэта не вырашыць усіх праблем і якасць жыцця глабальна не палепшыць, але гэта адзін з абавязковых крокаў, які неабходна зрабіць у дадзеным кірунку.

Камітэт ААН ужо двойчы заявіў у дачыненні да Расіі і Украіны, што словы «інвалід» і «чалавек з абмежаванымі магчымасцямі» ўжываць не зусім дарэчы. Больш карэктнымі фармулёўкамі з'яўляюцца «чалавек з інваліднасцю» і «чалавек з асаблівымі патрэбамі». Наогул, Канвенцыя аб правах інвалідаў пабудавана па прынцыпе «нічога пра нас без нас». Праблема складаная, і ў шэрагу прыватных выпадкаў можна назіраць сітуацыю, калі ніхто, акрамя чалавека з інваліднасцю, не можа лепш ведаць, якім чынам можна больш прымальна гарантаваць яго правы.

За словам «інвалід» губляецца сутнасць чалавека, застаецца толькі набор патрабаванняў, ільгот, абавязкаў з боку чыноўнікаў. Але чалавека за ім не відаць, і ў гэтым вялікая праблема. Таму можна яго не клікаць ні на якія абмеркаванні, не пытаць і наогул вырашыць усё за яго...

**Святлана БУСЬКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Такаеў заступіў на пасаду прэзідэнта Казахстана



Учора раніцай Касым-Жамарт Такаеў прынёс прысягу і заступіў на пасаду прэзідэнта Казахстана.

Напярэдадні Нурсултан Назарбаеў заявіў, што пакідае пасаду кіраўніка дзяржавы. Свае паўнамоцтвы — да выбараў новага прэзідэнта — ён перадаў Такаеву, які да гэтага быў старшынёй сената. Выбары ў Казахстане запланаваны на 2020 год.

Цырымонія прынясення прысягі адбылася ў ходзе сумеснага пасяджэння дзвюх палат парламента краіны. Кіраўнік Цэнтральнай выбарчай камісіі Берык Імашаў уручыў Такаеву пасведчанне прэзідэнта, штандар і ордэн.

Рашэнне Назарбаева Такаеў назваў валявым і прадыктаваным «меркаваннямі вышэйшага парадку» і «сапраўдным клопатам пра будучыню».

«Планую накіраваць свае веды і вопыт на забеспячэнне пераемнасці стратэгічнага курсу елбасы (лідара нацыі, Назарбаева. — **Заўв. рэд.**)», — сказаў ён.

Таксама Такаеў ўганараваў Назарбаева знакам адмысловай адзнакі «Залатая зорка» і званнем «Народны герой». Акрамя таго, ён прапанаваў перайменаваць сталіцу з Астаны ў Нурсултан.

Тым часам, паведаміла агенцтва ТАСС, экс-старшыня камітэта па міжнародных адносінах, абароне і бяспецы Сената (верхняй палаты парламента) Казахстана Дарыга Назарбаева (старэйшая дачка Нурсултана Назарбаева) у сераду па выніках галасавання абрана старшынёй Сената.

### Вялікабрытанія накіравала ЕС запыт аб пераносе Brexit на 30 чэрвеня

Аб гэтым гаворыцца ў пісьме, накіраваным прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі Тэрэзай Мэй старшыні Еўрапейскага савета Дональду Туску. Пра гэта паведаміла тэлеканалу Sky News крыніца ў брытанскім урадзе.

Як растлумачылі ў канцылярыі Мэй вяшчальнай карпарацыі Бі-бі-сі, пытанне аб адтэрміноўцы на працяглы перыяд не стаіць на парадку дня. Прэм'ер «не стане прасіць аб падобнай адтэрміноўцы», адзначаецца ў паведамленні. «Ёсць магчымасць даць парламенту крыху больш часу для ўзгаднення далейшых дзеянняў, але брытанцы чакаюць рашэння вось ужо амаль тры гады, — сказалі крыніцы. — Грамадзяне краіны засмучаны няздольнасцю парламента прыняць яго, і прэм'ер-міністр падзяляе іх расчараванне».

### НАТА адмовілася каментаваць словы Трампа аб магчымасці прыёму ў альянс Бразіліі

У штаб-кватэры НАТА адмовіліся каментаваць заяву прэзідэнта ЗША Дональда Трампа аб магчымасці прыёму ў Паўночнаатлантычны альянс Бразіліі. Пра гэта ТАСС паведамілі ў прэс-службе НАТА.

«Наконт гэтага пытання мы рэкамендуем звярнуцца да ўладаў ЗША»,— заявілі ў штаб-кватэры.

Раней Трамп падчас сустрэчы з прэзідэнтам Бразіліі Жаірам Балсанару ў Белым доме заявіў у адказ на пытанне аб магчымым членстве Бразіліі ў Паўночнаатлантычным альянсе, што бакі «рашуча разглядаюць гэта і ў значнай ступені схіляюцца да гэтага».

# У БІЗНЕС-АСЯРОДДЗІ ЎЗРОС АПТЫМІЗМ

## У IT-сферы Беларусі плануецца стварэнне 2,5 мільёна рабочых месцаў

**Дыялог прадпрымальніцтва і ўлады становіцца больш шчырым — пра гэта сведчаць вынікі 14-га Індэкса дзелавога аптымізму ў Беларусі. Праведзенае анкетнае апытанне 523 прадпрымальнікаў з усіх рэгіёнаў краіны паказала, што ўзровень іх даверу ўзрос. Не нашмат: з 0,14 у лютым 2018-га да 0,15 у сакавіку 2019-га, але ж гэта адна сотая — паказчык станоўчай тэндэнцыі пасля некалькіх гадоў адмоўных паказчыкаў.**

Патрэбнасці, праблемы і прапановы бізнес-супольнасці абмеркавалі ўчора ў Мінску ўдзельнікі I Рэспубліканскага дзелавога форуму «Развіццё прадпрымальніцтва ў Беларусі: стратэгія і тактыка». Ключавое мерапрыемства IV Тыдня беларускага прадпрымальніцтва эксперты ўжо назвалі гістарычнай падзеяй, бо разам з усімі галінамі дзяржаўнай улады абмеркаваны таксама праект Нацыянальнай платформы бізнесу Беларусі на 2019—2020 гады «Будучыня бізнесу — будучыня краіны».

Беларускі сярэдні клас мусіць стаць моцным і крэатыўным. Так, у выніку супрацоўніцтва мясцовых суб'ектаў з IT-кампаніямі ў наступныя 17 гадоў запланавана стварэнне 2,5 мільёна рабочых месцаў. Мэта — вытворчасць да 80 % валавога ўнутранага прадукту з дапамогай малага і сярэдняга бізнесу. І гэта дасягальныя паказчыкі, упэўнены старшыня (сустаршыня) рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, старшыня клуба «Беларусь — IT-краіна-2050» Ігар Мамоненка.

Для эфектыўнай працы ў кожным буйным населеным пункце павінны быць створаны цэнтры развіцця прадпрымальніцтва, а ад мясцовых уладаў чакаюць кропкавай дапамогі, а не абмеркавання макраэканамічных праблем. Гэта падкрэсліў **старшыня прэзідыума рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН.**

Прыярытэтнымі кірункамі ў рэфармаванні дзелавога клімату краіны ў 2019 годзе прапанавана лічыць добрасумленную канкурэнцыю, рэгулятарную канкурэнтаздольнасць, партнёрства буйнога і малога бізнесу як аснову эканамічнай бяспекі, падатковую канкурэнтаздольнасць, інстытуцыйную і тэхналагічную мадэрнізацыю, адказнае партнёрства.

Пры падрыхтоўцы Нацыянальнай платформы бізнес-супольнасць пагадзілася, што ў 2019 годзе Беларусь сутыкаецца з сур'ёзнымі ўнутранымі і знешнімі выклікамі, а ключавы фактар для працвітання — эканамічная свабода. Уладзімір Карагін лічыць яе самым важнымі нематэрыяльным актывам. Буйны прыватны бізнес — самы надзейны, якасны і перспектыўны інстытут для дасягнення ў Беларусі хуткага, доўгатэрміновага эканамічнага росту.

Як падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіслаў ШЧЭПАЎ**, значная частка законапраектаў, што разглядаюцца на кожнай сесіі, так ці інакш звязаная з эканомікай і прадпрымальніцтвам. Мэты ў заканадаўцаў і бізнесу аднолькавыя — ствараць для грамадзян магчымасці. І магчымасці роўныя, бо выпускнік сельскай школы хоча працаваць і зарабляць не менш за жыхара горада-мільённіка.

У форуме ўзялі ўдзел прадстаўнікі мясцовай улады з 60 рэгіёнаў, а таксама актыўныя юнакі і дзяўчаты Беларусі. Дарэчы, для іх гэта не апошняя магчымасць павучыцца ў кампетэнтных спецыялістаў: пасля заканчэння Тыдня беларускага прадпрымальніцтва 25 сакавіка пачнецца Тыдзень фінансавай адукаванасці для дзяцей і моладзі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

---

Пасля «Вялікай размовы»

# Стадыён будзе!

**Пытанне задаў Сяргей Балабанаў са Скідзеля. Яго, як спартсмена, хвалюе праблема спартыўных збудаванняў у горадзе-спутніку Гродна. На яго думку, для гэтых мэт можна выкарыстаць пустыя будынкі. Таксама для заняткаў футболам у зімовы час патрэбны адпаведны спартыўны павільён.**

У абласным упраўленні спорту і турызму паведамілі, што гарадскі стадыён у Скідзелі плануецца рэканструяваць у 2020 годзе. На аднойленым аб'екце з'явіцца сучаснае футбольнае поле, бегавыя дарожкі, сектары для заняткаў лёгкай атлетыкай. Будуць абсталяваны пляцоўкі для гульнявых відаў спорту і іншыя збудаванні. Самае галоўнае — будзе новая спартыўная зала. Яна ўзводзіцца разам з рэканструкцыяй СШ № 1 Скідзеля. Работы будуць завершаны сёлета ў жніўні.

А вось прыстасаваць пустыя будынкі пад спартыўныя аб'екты, як прапануе жыхар Скідзеля, пакуль не атрымаецца. Тлумачэнні наконт гэтага даў **старшыня гарадскога выканаўчага камітэта Аляксандр ЛАЗАВІК.** Ён паведаміў, што пустыя аб'екты, у тым ліку былая мэблевая крама, знаходзяцца ва ўласнасці мясцовага спажывецкага таварыства, таму гарадскія ўлады не могуць імі распараджацца. Але пры жаданні будынкі можна выкупіць альбо арандаваць.

Наяўнасць спартыўных аб'ектаў актуальная для Скідзеля. Тут існуе дзясятак спартыўных секцый, а бейсбольная каманда «Цукровы шторм» вядомая на ўсю краіну.

Усяго ў вобласці 3,5 тысячы спартыўных аб'ектаў. Летась уведзена, будуюцца спарткомплексы ў Навагрудку і Астраўцы. Ёсць планы па рэканструкцыі басейнаў у Смаргоні і Мастах.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

---

Блізкая ўлада

# Ідэолаг — універсальны работнік

**На калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама абмеркавалі новыя формы работы з насельніцтвам. Начальнік галоўнага ўпраўлення Таццяна ГАГАКАВА расказала, як вядзецца гэта работа ў раёнах, на асобных прадпрыемствах, у арганізацыях.**

Перш чым правесці сустрэчу ў працоўным калектыве, праводзіцца маніторынг праблем і пытанняў, якія хвалююць людзей. Напрыклад, у Івацэвіцкім раёне гэта работа вядзецца праз сайт раённай газеты «Івацэвіцкі веснік». Там кожны месяц праводзіцца апытанні, змяшчаюцца анкеты. Гэта дапамагае ведаць меркаванні людзей, выяўляць праблемы, якія найбольш актуальныя для той ці іншай мясцовасці. Пінскі гарвыканкам праводзіць інтэрнэт-галасаванне ў сацыяльных сетках.

У ходзе калегіі ідэолагі адзначалі неабходнасць інфармацыйнага суправаджэння многіх знакавых падзей, юбілейных дат, грамадска-палітычных кампаній гэтага года. Як вядома, сёлета працягваецца праект пад назвай Год малой радзімы, Беларусь адзначае 75-годдзе вызвалення, чакае II Еўрапейскія гульні, рыхтуецца да перапісу насельніцтва. Брэсцкія ідэолагі справай гонару лічаць дастойна адзначыць 1000-гадовы юбілей Брэста, 80-годдзе ўтварэння вобласці.

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ**, які прымаў удзел у рабоце калегіі, адзначыў асаблівую ролю работнікаў гэтай сферы: «Ідэалагічны работнік — універсальны работнік. Ён павінен адчуваць настрой і патрэбы людзей, умець уплываць на сітуацыю». **Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь БАРЫСЮК** падкрэсліў асаблівую важнасць якаснай інфармацыйнай работы з насельніцтвам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

Далучайцеся

# Узнагарода шукае пераможцу

**Абвешчаны дваццаць першы конкурс на саісканне прэміі ўрада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці.**

Яна присуджаецца юрыдычным асобам незалежна ад формаў уласнасці за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, паслуг або работ, укараненне інавацыйных тэхналогій, метадаў менеджменту, а таксама эфектыўнае і сацыяльна адказнае вядзенне бізнесу.

Прэмія прысуджаецца арганізацыям з колькасцю працоўных да 250 чалавек, ад 250 да 1500, а таксама звыш 1500 супрацоўнікаў па пяці кірунках, а менавіта: вытворчасць нехарчовай прадукцыі бытавога прызначэння, вытворчасць харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі, вытворчасць прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння (акрамя ўзбраення і ваеннай тэхнікі), аказанне паслуг і выкананне работ, выкананне работ і аказанне паслуг у галіне будаўніцтва.

Вызначэнне пераможцаў — у два этапы: па выніках праверкі прадстаўленых матэрыялаў і шляхам правядзення экспертызы на месцах.

Заяўкі і матэрыялы падаюцца да 1 чэрвеня 2019 года ў сакратарыят камісіі, які сфарміраваны пры Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі.

Неабходныя кансультацыі можна атрымаць у Беларускім дзяржаўным інстытуце стандартызацыі і сертыфікацыі: 220113, Мінск, вуліца Мележа, 3. Тэлефон: +375 17 269 69 64.

Падрабязная інфармацыя аб конкурсе размешчана на інтэрнэт-сайтах Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by/ Качество и деловое совершенство) і сакратарыята конкурсаў у галіне якасці (www.quality.by).

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

---

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ТРАНСПАРТНЫ ЗБОР БУДЗЕМ ПЛАЦІЦЬ ПА-НОВАМУ

**Праект указа аб змене плацяжоў за ўдзел у дарожным руху ўнесены ў Адміністрацыю Прэзідэнта.**

Як паведаміў учора **намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО**, праект указа аб змене плацяжоў за ўдзел у дарожным руху ўжо ўнесены на разгляд у Адміністрацыю Прэзідэнта, перадае карэспандэнт **БелТА**.

«Адпаведны праект указа адпраўлены ў Адміністрацыю Прэзідэнта, мы чакаем вынікаў разгляду», — сказаў Дзмітрый Кійко.

Асноўныя падыходы, прапанаваныя Мінфінам і падтрыманыя ўрадам,— адвязаць транспартны збор ад тэхагляду і прадугледзець магчымасць яго выплаты па месяцах, гэта значыць, непасрэдна ў той перыяд, калі ўласнік карыстаецца транспартным сродкам.

Як паведамлялася, праект указа, які выносіўся на грамадскае абмеркаванне, прадугледжваў, што замест дзяржпошліны за выдачу дазволу на допуск да ўдзелу ў руху з фізічных асоб уводзіцца плата за ўдзел у дарожным руху. Стаўкі платы ўстановяць у базавых велічынях, яны будуць залежаць ад віду транспарту. Прадугледжаны таксама новыя тэрміны аплаты і скідкі, фотафіксацыя парушэнняў. Меркавалася, што новыя правілы могуць уступіць у сілу з 1 красавіка.

## ВАМ — У «ПАРК СЯМЕЙНЫХ ДРЭВАЎ»

**Рэспубліканскі праект з такой назвай распачаўся з Брэста.**

Першая алея з удзелам дзесяці самых актыўных, творчых і спартыўных сем'яў абласнога цэнтра закладзена ў парку 1000-годдзя горада.

Удзельнікі акцыі высадзілі саджанцы ліп, якія стануць своеасаблівым сімвалам сямейнага дабрабыту, любові і вернасці. Бо нездарма славяне ўшаноўвалі ліпу як святое дрэва, як дрэва-маці, што дорыць сваім дзецям усё неабходнае. Кожная сям'я прымацавала на дрэва імянную шыльдачку, дзе пазначаны члены сям'і, дата стварэння сям'і або іншыя важныя даты і падзеі. Плануецца, што ўдзельнікі акцыі будуць даглядаць свае дрэвы, перадаючы іх у «спадчыну» з пакалення ў пакаленне.

У сакавіку — красавіку праект «Парк сямейных дрэваў» пройдзе ў кожным рэгіёне Брэсцкай вобласці. Пінск і Баранавічы наступнымі падхопяць эстафету па пасадцы сямейных паркаў і алей.

Асноўнымі арганізатарамі праекта выступаюць Брэсцкі абласны камітэт БРСМ і Брэсцкі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пры падтрымцы гарадскога выканаўчага камітэта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПА РАСКЛАД ЛЕКЦЫЙ — У САЦЫЯЛЬНУЮ СЕТКУ

**Унікальны тайм-бот для сацыяльнай сеткі «УКантакце» https://vk.com/timebot_sb распрацавалі чацвёртакурснікі Інстытута бізнесу БДУ. Ідэя належыць Раману Шабановічу, а тэхнічная рэалізацыя — Андрэю Таўкіну.**

Інфармацыя на тайм-бот паступае з сервера сайта Інстытута бізнесу БДУ. З дапамогай рэсурсу студэнты і выкладчыкі цяпер могуць аператыўна даведацца пра час заняткаў у любы дзень тыдня. Для гэтага ім дастаткова выбраць каманду «Расклад», увесці нумар групы, і тайм-бот паведаміць ім пра час, месца правядзення заняткаў, а таксама імя лектара. Акрамя таго, рэсурс змяшчае каманду «Выкладчык»: анлайн-памочнік можа паказаць графік любога выкладчыка па заяўленым прозвішчы. Таксама ў карыстальнікаў ёсць магчымасць падпісацца на рассылку абвестак.

Па дапамогу да рэсурсу штодня звяртаецца каля 500 студэнтаў Інстытута бізнесу БДУ. Паслугі віртуальнага памочніка абсалютна бясплатныя, неабходна толькі зарэгістравацца ў сацыяльнай сетцы «УКантакце». У перспектыве распрацоўшчыкі дапоўняць рэсурс новымі магчымасцямі. Таксама яны гатовы ўкараніць таймбот для студэнтаў іншых факультэтаў і вышэйшых навучальных устаноў.

У найбліжэйшы час плануецца наладзіць узаемадзеянне метадыстаў са студэнтамі напрамую. Гэта дазволіць аператыўна атрымліваць інфармацыю аб непрадбачаных зменах у раскладзе, а таксама падзеях і мерапрыемствах у БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ВЫПІЛІ ТАСОЛ І ШКЛОАЧЫШЧАЛЬНІК

**У Гродзенскай вобласці трое мужчын памерлі ад атручэння тэхнічнай вадкасцю.**

Найбольш трагічны выпадак адбыўся ў Лідзе. Пасля таго як удалося адчыніць закрытыя знутры дзверы, у кватэры былі знойдзены целы двух мужчын. Таксама тут знаходзіліся пластыкавыя каністры, згодна з этыкеткамі — са шклоамывальнікам. Пры гэтым у адной частка вадкасці адсутнічала, а пустая пластыкавая ёмістасць, знойдзеная ў кватэры, утрымлівала рэзкі хімічны пах.



Літаральна на другі дзень ужо ў Іўеўскім раёне былі дастаўлены ў бальніцу двое мужчын, адзін з якіх у хуткім часе памёр. Аказалася, што яны выпілі тасол. Пры гэтым было ўстаноўлена, што напярэдадні яны разам з двума іншымі знаёмымі таксама ўжывалі гэтую тэхнічную вадкасць. У выніку — смерць аднаго з мужчын і бальнічны ложак для другога.

Па выпадках у Лідзе і Іўі праверку вядуць райаддзелы Следчага камітэта сумесна з органамі ўнутраных спраў, паведаміў афіцыйны прадстаўнік УСК па Гродзенскай вобласці Сяргей Шаршаневіч. Вядзецца апытанне родных і знаёмых атручаных. Прызначаны судова-медыцынскія экспертызы ў адносінах да памерлых і пацярпелага, а таксама судова-хімічныя экспертызы для высвятлення саставу вадкасці з двух месцаў здарэння.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Цэтлікавы дзёгаць у пластыкавым мёдзе

## Выкарыстоўваць нельга выкінуць

Як вядома, палімер — адзін з самых шкодных відаў другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), аднак агулам казаць, што пластык — гэта шкодна, і ад яго выкарыстання трэба пазбаўляцца, няправільна.

Напрыклад, вырабы для ўпакоўкі харчовых прадуктаў — фасовачныя пакеты перш чым трапіць у крамы, праходзяць праз жорсткія нормы і рэгламенты якасці. Але гэта датычыцца поліэтылену высокага ціску — адзінага палімера, які вырабляюць у Беларусі. Астатнія ж віды поліэтылену — гэта экспарт,






дзе галоўны арыенцір кошт, а не экалагічнасць.

— Нам неабходна развіваць пластмасавую культуру вырабу і выкарыстання прадукту. Кожны можа вырашыць, ці набываць яму тое, што не перапрацоўваецца, і ў вытворцы не будзе шанцаў рабіць такі прадукт, калі яго не будуць купляць, — мяркуе **дырэктар АТ «Барысаўскі завод пластмасавых вырабаў» Уладзімір КАЗЛОЎСКІ.** — Нам неабходна абараніць зямлю і забараніць увоз і выраб прадукту, які не перапрацоўваецца.

Дырэктыва № 7 «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

(ЖКГ) краіны», на яго думку, вельмі актуальны дакумент. Ён датычыцца некалькіх тэм, якія закранаюць амаль усе кірункі дзейнасці прадпрыемства. Гэта вытворчасць палімерных вырабаў для кантакту з харчовай прадукцыяй. Стварэнне труб для водазабеспячэння, што адпавядае кірунку па павышэнні якасці вады. Перапрацоўка палімераў і выраб з іх новай прадукцыі.

Менавіта павелічэнне жыцця прадукту праз сістэму рэцыклінгу, калі выкарыстаны палімер перапрацоўваюць і з атрыманай сыравіны вырабляюць новы тавар, адзін з самых актуальных кірункаў сучаснай работы завода ў экалагічным плане.

## ПЭТ-бутэлька і ПВХ-этыкетка, пакет і наклейка

— Палімеры можа і трэба выкарыстоўваць у жыцці, аднак так, каб гэта было па крузе, каб у ланцужку рэцыклінгу не было перарываў. Аднак яны ёсць, — кажа кіраўнік прадпрыемства. — ПЭТ-бутэльку, напрыклад, можна перапрацаваць на шматкі, і ў нашай краіне гэта робяць, адно не вырабляюць з іх гатовага прадукту. А вось этыкетку ПВХ, якую нярэдка клеяць на тару, перапрацаваць нельга. Пры гэтым яе дадатковае змыванне і аддзіранне ад бутэлькі ўдаражае працэс.

Бутэлькі, апранутыя ў этыкетку-«панчоху», якая абгортвае выраб амаль цалкам, — увогуле бяда. Абсталяванне па сарціроўцы проста адкідае такую тару, а ўручную здымаць такія «панчохі» эканамічна зусім немэтазгодна. З гэтай прычыны ў многіх краінах ПВХ і забаронена для выкарыстання, і кіраўніцтва завода пластмасавых вырабаў таксама будзе прапаноўваць, каб такі ж заканадаўчы акт быў прыняты і ў Беларусі.

— Кепска, нават калі на пакеце маецца нейкая наклейка. Зроблены з поліэтылену высокага ціску выраб можна выкарыстаць паўторна, а кожная этыкетка — гэта ўжо лыжка дзёгцю ў бочцы пластыкавага мёду, — кажа Уладзімір Казлоўскі.



Часта ў тавары змешваюць палімеры, прыдатныя для перапрацоўкі, і непрыдатныя. Напрыклад, аднаразовыя талеркі, лыжкі, відэльцы, нажы, кубачкі, якія прадаюцца ў пакеце. З посуду атрымаецца другасная сыравіна, а з яго ўпакоўкі — не. Таму купляць пластыкавы посуд лепш паасобку, без тары, так і танней, дарэчы, раіць кіраўнік прадпрыемства. Не перапрацоўваюцца і прыгожыя яркія саломінкі для кактэйляў. Менш прывабныя і больш дарагія — можна, пра гэта і на іх упакоўцы напісана. Упакоўка з-пад чыпсаў, зефіру, прадуктаў хуткага гатавання — таксама прамыя жыхары звалак.

## Другасны палімер — гранула — новы тавар

Поліэтылен прыйшоў да нас з Еўропы ў 60-я гады мінулага стагоддзя, у час развіцця пластмасы. Цяпер у Беларусі ствараецца каля 300 тысяч тон палімераў, з якіх перапрацоўваецца каля 86 тысяч тон, хоць магутнасцяў у краіне хапае на 90 тысяч. Напачатку работы па вырабе прадукцыі з ДМР на барысаўскім заводзе выкарыстоўвалі 4-5 % такой сыравіны, а ўжо летась яе стала 30,2 %. На перапрацоўку прадпрыемства купіла ў 2018 годзе амаль 4000 тон палімераў. Завод, дарэчы, працуе кругласутачна, абсталяванне адпачывае толькі па выхадных.

Другасную сыравіну ў пэўных прапорцыях тут дадаюць пры вырабе многіх тавараў. Плітку для тратуараў, напрыклад, на 95 % «гатуюць» з ДМР. Яна вытрымлівае нагрузку ў пяць тон, аднак у краіне пакуль не вельмі распаўсюджаная. Тое ж датычыцца і пластыкавых люкаў, трываласцю да 1,5 тоны, якія ўжываюцца больш у Еўропе, чым дома. Штомесяц адна-дзве фуры ідуць за мяжу.

Дырэктар запрасіў журналістаў на ўласныя вочы пабачыць, як робіцца прадукцыя з выкарыстаннем другаснай сыравіны, і правёў па прадпрыемстве экскурсію. Спачатку мы апынуліся на ўчастку па вытворчасці прадукцыі метадам ліцця пад ціскам, дзе «гатуюць» плёнку.

Пабачылі мы, і як на заводзе робіцца поліэтыленавая «вопратка» для труб. З іх тут, дарэчы, склалі эксклюзіўную пясочніцу. Па форме нагадвае ніжнюю частку хаткі з бярвенняў, праўда, у адрозненне ад сапраўднага дрэва гэтыя дэталі ніколі не сапсуюцца і не зламаюцца, іх нават кавадлам не разбіць. А адну з дэталяў для пластыкавай лаўкі, якая на 100 % робіцца з ДМР, журналістам нават дазволілі спрэсаваць самастойна.

Перш чым апынуцца на лініі сарціроўкі поліэтыленавага смецця, трапляем у поліэтыленавы лабірынт. На вуліцы тут захоўваецца месячная норма адходаў для работы лініі.

— Матэрыял сюды трапляе самай рознай ступені забруджанасці, — кажа Уладзімір Казлоўскі. — Апроч таго, у цюках з сабраным асобна пластыкавым смеццем на завод можа трапіцца што заўгодна: цагліны, абутак, камяні... Таму на лініі сарціроўкі ўручную адбіраюць з поліэтыленавых адходаў лішкі і палімеры, якія нельга перапрацаваць.

Другасная сыравіна тут мыецца ад бруду, драбніцца на гранулы, зноў мыецца, адціскаецца і сушыцца. І ўжо пасля з такой сыравіны робіцца новы поліэтылен. Працэсы гэтыя несупынныя. Абсталяванне, кажуць, апошні раз выключалі толькі на Новы год.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота Андрэя САЗОНАВА.**







Аўта

# ГАЛАСУЕМ РУБЛЁМ

## На заводзе «БелДжы» плануюць выпускаць абсалютна новую мадэль

**Яна называецца Geely SX11 — гэта сучасны красовер, які арыентаваны на маладзёжную аўдыторыю. Пра гэта заявіў Генадзь Свідзерскі, выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара СЗАТ «БелДжы».**

Такім чынам, у планах: у другой палове 2019 падрыхтаваць 100 мадэляў SX11, каб высветліць, ці будзе сярод беларускага насельніцтва попыт на гэтыя аўто. Дарэчы, гэтая машына абсталявана фірменнай модульнай платформай BMA, якая дазваляе выкарыстоўваць як традыцыйны рухавік унутранага згарання, так і гібрыдную сілавую ўстаноўку.

Яшчэ ў планах завода — праверыць попыт і на рэстайлінгавы седан прадстаўніцкага класа Emgrand GT. Такім чынам, калі стане зразумела, што мадэлі папулярныя і іх гатовыя купляць, то наладзяць масавую вытворчасць на 2020 год. Важны момант: у выпадку ўводу новай мадэлі, давядзецца завяршыць вытворчасць адной з наяўных.

Сам выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара назваў мінулы год напружаным, але паспяховым, як у рамках развіцця завода, так і ў рамках партнёрскай праграмы па крэдытаванні і лізінгу. За год было выпушчана больш за 11 тысяч аўтамабіляў, большая частка з якіх пайшла на экспарт у Расію, а астатнія былі рэалізаваны ў нашай краіне.

Сёння завод выпускае тры мадэлі аўтамабіляў у 27 мадыфікацыях і сямі колерах. Такім чынам, атрымліваецца 189 розных выкананняў. Калі першапачатковая колеравая палітра была абмежавана чорным і белым, то сёння аўто гэтай маркі можна замовіць у чырвоным, карычневым, бурштынавым і іншых колерах.

Больш за 65 % пакупнікоў легкавых аўтамабіляў маркі — гэта фізічныя асобы. Па праграме лініі крэдытавання ім было рэалізавана 2200 аўтамабіляў. Безумоўна, выгадныя крэдытныя прапановы спрыялі значнаму павелічэнню продажаў гэтых аўто. Аднак праграма была разлічана ўсяго на год. Генадзь Свідзерскі развеяў усе чуткі: БПС-Ашчадбанк і СЗАТ «БелДжы» працягнулі праграму і на 2019 год, аднак памяняліся ўмовы. Пагадненні таксама падпісаныя з ААТ «ААБ Беларусбанк» і ТАА «ААБ Лізінг».

Зараз падрабязнасці аб ільготных умовах «БПС-Ашчадбанка» — яны дзейнічаюць на ўсе аўтамабілі Geely, сабраныя ў Беларусі. Працэнты пры гэтым будуць вар'іравацца: на мадэль Emgrand 7 стаўка банка застанецца ранейшай — 1,9 % гадавых. Пры куплі астатніх мадэляў, у тым ліку Geely Atlas, крэдыт абыдзецца ў 3,9 % гадавых.

Як расказаў старшыня праўлення ААТ «БПС-Ашчадбанк» Ігар Меркулаў, за час работы праграмы было выдадзена каля 1000 пазык на куплю аўто маркі Geely.

...У лютым гэтага года стартавалі продажы Geely Atlas 1,8 Turbo — менавіта гэты матор чакалі многія беларускія аўтааматары. У сувязі з вялікім попытам на гэтую мадэль плануецца перагледзець аб'ёмы продажаў на 2019-ы. Цікава, што сёлета на заводзе маюць намер зрабіць 20 тысяч аўтамабіляў.

Акрамя таго, сёлета запланаваны адкрыццё дылерскага цэнтра ў Салігорску і новага шоу-рума ў Магілёве, а таксама пунктаў продажаў у Наваполацку. Таксама прадпрыемства хоча пашырыць геаграфію паставак і вядзе перамовы з зацікаўленымі асобамі ў Літве, Малдове, Сербіі, Украіне і Польшчы.

Яшчэ плануецца адкрыццё станцый сэрвіснага абслугоўвання ў буйных гарадах краіны, на першым этапе — у Брэсцкай і Гомельскай абласцях.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# Саломкі не набярэшся

Нават калі ў вас ідэальныя дзеці, якія растуць і развіваюцца паводле нормаў педыятрыі, вам трэба мець невычарпальныя залежы цярпення, непарушны спакой, паслядоўнасць Тэрмінатара і кілатоны мудрасці, каб захаваць роўны, пазітыўны мікраклімат у сям'і. Калі ж хоць адно дзіця «не такое, як ва ўсіх» — датычыцца гэта фізіялогіі ці псіхалогіі, унутраных ці знешніх уласцівасцяў, — запас нервовай трываласці мусіць быць яшчэ большым, рук трэба мець столькі, як у багіні Калі, і ў дадатак вочы на патыліцы. Смешна? Ды не вельмі, улічваючы, як часта ў зводкі навін трапляюць паведамленні пра няшчасныя выпадкі з дзецьмі, у чым вінаватыя — найперш мы, дарослыя.

Паводле статыстыкі, у 2011 годзе ў Беларусі ад знешніх прычын загінула 262 дзіцяці, у 2015 годзе — 149, у 2016-м — 154. І хоць трагічныя лічбы паступова памяншаюцца, крый божа трапіць у гэтыя «працэнты». Спецыялісты падлічылі: дастаткова 30 секундаў, каб дзіця самастойна адчыніла акно, імгнення — каб пацягнула і выліла на сябе кіпень. Дзеці трапляюць у пажары і ДТЗ, тонуць літаральна ў лужынах, задыхаюцца з-за праглынутых манет, выпіваюць хімічныя сродкі, — і, як правіла, таму, што бацькі альбо бабулі і дзядулі «на хвілінку» выйшлі ў іншы пакой ды заняліся сваімі справамі.

Натуральна, можна заспакойваць сябе тым, што гэта адбывалася заўжды, проста ў эпоху паўсюднага інтэрнэту шыла з меха выпадае раней, чым яго туды пакладзеш. З іншага боку, вярніцеся ў думках усяго на адно пакаленне назад (у сучаснай дэмаграфіі гэта каля 25 гадоў) і адкажыце шчыра: хіба было на той час столькі дадатковых рызык і небяспек: якой была колькасць аўто на дарозе, ці шмат налічвалася электрапрыбораў і батарэек у кожным доме, што мы ведалі пра маскітныя сеткі, гіраскутары, цюбінгі і г. д.? Успамінаю ўласнае дзяцінства: на стаянцы каля дома мы гулялі ў «штандара» і выкладвалі мазаіку з каменьчыкаў — проста таму, што аўто тут стаяла ўсяго адно, а нашы людзі «ў булачную на таксі» ездзілі вельмі рэдка. І гэта не вясковая вуліца, а сталічны спальны раён і шматпад'езны дзевяціпавярховік!

Цяпер іншы час і, адпаведна, іншыя хваляванні, таму ўдвая дзіўная пастаральная легкадумнасць, якую часам праяўляюць бацькі і старэйшае пакаленне ў дачыненні да дзяцей. Маўляў, я ў шэсць гадоў з ключом на шыі праз увесь горад ездзіў, што з маім малым зробіцца ў двары і тым больш у хаце. Адкрыйце зводку МНС за апошнія некалькі месяцаў — даведаецеся.

Я ні ў якім разе не заклікаю да панікі і істэрыкі, як у вядомай казцы пра «разумныя галовы», — ці помніце, як разладзілася вяселле з-за квахтання патэнцыйнай нявесты «сядзеў бы тут наш сынок, сякера б упала і яго забіла...»? Саломкі на ўсё жыццё дакладна не набярэшся. Большасць дарослых, адэкватных людзей цудоўна разумее, як небяспечна ўключыць рэжым гіперапекі («яжмаці!») і на доўгія гады затрымацца ў стане «мы»: «мы паелі», «мы збіраемся ў школу», «мы думаем, куды паступаць», а ў адзін далёка не цудоўны момант раптам спахапіцца, што дзіця ў параўнанні з аднагодкамі менш самастойнае і больш інфантыльнае. З іншага боку, як насаджэнне жорсткіх «не», так і празмерная свабода дзеянняў спрацоўвае не заўжды і не з усімі і часта вылазіць вонкі ўжо ў свядомым узросце — добра, калі толькі эмацыянальнай халоднасцю да састарэлых бацькоў. Пытанняў, як быць з дзецьмі ў тым ці іншым выпадку, хапіла б на энцыклапедыю ў дзясятках тамоў, дый то жыццё знойдзе, чым здзівіць не аўтараў і складальнікаў.

І вось кожны з бацькоў, як той канатаходзец, балансуе паміж строгасцю і агрэсіяй, пяшчотай і патуранне, уласнымі педагагічнымі ўстаноўкамі і агульнапрынятымі ў грамадстве правіламі ды стэрэатыпамі.

Трымайцеся, «калегі». Помніце, што выхоўваць варта не столькі дзяцей, колькі сябе — будзе дзіця ў дарослым жыцці ініцыятыўным альбо бязвольным, уважлівым альбо бестурботным, перадусім залежыць ад нас. Галоўнае, каб наогул вырасла — жывым, здаровым і шчаслівым.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Сямейная газета

Выпуск № 5 (120)

Жанчына года — 2018

**Пераможца конкурсу ў намінацыі «Мацярынская слава» Юлія ТРЫКОЗА:**

# «З ТРЫМА ДЗЕЦЬМІ МОЖА СПРАВІЦЦА КОЖНАЯ ПАРА»



**Тры гады таму прозвішча Трыкоза ўжо было на слыху. Шматдзетная сям'я ўдастоілася звання найлепшай у Мінску. Тады Уладзіслаў і Юлія падзяліліся формулай уласнага шчасця: «Каб быць прыкладам для сваіх дзяцей, нічога асаблівага не трэба. Любіць адно аднаго, клапаціцца і паважаць». Сёння мы зірнём на адносіны ўнутры сям'і з пункту гледжання матулі і пагаворым аб яе працы ў Генеральнай пракуратуры, кніжках па выхаванні і жаночым характве.**

— Я расла ў звычайнай савецкай сям'і: мама, тата, малодшы брат. Жылі сціпла, але дружна. Асабліва весела было, калі на святы да нас прыязджалі матуліны сёстры і браты з дзецьмі. Ужо тады я разумела: вялікая сям'я — гэта добра, — пачынае Юлія.

***— Вас можна назваць прыкладам той жанчыны, вобраз якой сёння можа лічыцца эталонным. Дасягнулі поспеху і ў кар'еры, і ў сямейных справах.***

— Прызнаюся, кар'ерысткай сябе ніколі не бачыла, хоць і маю тры вышэйшыя адукацыі. Мая першая спецыяльнасць звязаная з эканомікай, па другой я спецыяліст мытнай справы, трэцяя адукацыя — юрыдычная.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Простыя ісціны

# УСЁ ВЫРАШАЛАСЯ Б ЛЁГКА, КАЛІ Б... НЕ ЖЫЦЦЁ

## Бацькоўства павінна быць не толькі высокамаральным, але і прагматычным

**«Што рабіць, калі 16-гадовы хлопец хлусіць бацькам?» — «А вы заўжды сваім бацькам гаворыце праўду, нават цяпер, калі сталі дарослымі?». «Як не страціць давер падлетка?» — «Трэба рыхтавацца да магчымых канфліктаў загадзя, бо ўзрост такі». «Чаму дачка наўмысна прычыняе сабе фізічны боль?» — «Яна так перажывае моцныя эмоцыі, пра якія не адважваецца пагаварыць».**

Кароткія пытанні і адказы, якія нагадваюць бліц-апытанку, — гэта пачатак сустрэчы з **кандыдатам псіхалагічных навук Надзеяй ЦЫРКУН,** якую ў межах праекта «Тата-школа» зладзіла аб'яднанне «Клуб ільвоў» у Мінскім цэнтры тэрытарыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.

### СЛУХАЙ — І ЗНОЙДЗЕШ РАШЭННЕ

На пачатку дзеі псіхолаг задае кожнаму пытанне: якую мэту ён пераследуе, прыйшоўшы сюды, і чаго чакае. Праз адказы прысутных Надзея Аляксандраўна не толькі атрымлівае ўяўленне аб тым, што найбольш хвалюе ўдзельнікаў, але і паспявае коратка



пракаментаваць сітуацыю, калі чалавек прыходзіць на сустрэчу з надзеяй атрымаць рашэнне праблем сваёй сям'і.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Дзеці ў бяспецы

# ПРЫГОЖА, МАБІЛЬНА, ІНФАРМАТЫЎНА

**Перасовачны куток бяспекі дапаможа спецыялістам навучыць маладых і будучых бацькоў правільна і бяспечна арганізоўваць прастору для дзяцей.**




Дэманстрацыя «бокса бяспекі».

Першы «бокс бяспекі» ад аргкамітэта сацыяльнага праекта «Дзеці ў бяспецы» атрымаў Клінічны радзільны дом Мінскай вобласці.

— Стварэнне такіх мабільных боксаў — гэта бліскучая ідэя, — пракаментаваў **галоўны ўрач установы Пётр МАСЬКО.** — Гэта дэманстратыўная пляцоўка на колах, з якой лёгка можна ўехаць у палату, у ліфт, у любое аддзяленне. Ствараючы такую пляцоўку, мы з арганізатарамі ініцыятывы некалькі дзён спрачаліся і абмяркоўвалі дэталі. Цяпер вы бачыце вынік — прыгожа, мабільна і інфарматыўна.

Спецыяліст расказаў, што ў праект «Дзеці ў бяспецы» ўцягнута вялікая колькасць супрацоўнікаў радзільнага дома. Урачы ўпэўнены, што вельмі важна, каб ініцыятыва была распаўсюджана, каб кожны спецыяліст мог кампетэнтна і проста расказаць маладым бацькам, як прадухіліць дзіцячы траўматызм.

— Згодна са статыстыкай, існуе два пікі траўматызму, — расказвае **Наталля НАЎРОЦКАЯ, кіраўнік гэтага праекта.** — Першы — падлеткавы ўзрост, другі — дзеці да шасці гадоў. Якраз тады, калі дзеці павінны быць пад наглядам маці. На самай справе маці, якая знаходзіцца побач, не заўсёды назірае за малым. Асноўная задача ў тым, каб стварыць бяспечную прастору, каб дзіця магло без пастаянных вокрыкаў «нельга» і «не чапай» пазнаваць свет.

Такі бокс літаральна нашпігаваны элементамі бяспекі — гэта мацаванне для тэлевізара, фіксатары для камоды, стэлажоў, дзвярэй халадзільніка, заглушкі для разетак, абарона на кветкавыя вазоны, абарона ад вострых вуглоў і г. д. І ўсё гэта можна ўбачыць на свае вочы і памацаць рукамі.

— У боксе змешчаны двухбаковыя панэлі, на якіх паказаны асноўныя зоны, што ёсць у любой кватэры ці доме, — расказвае Наталля Наўроцкая. — Гэта кухня, ванны пакой, гасціная і дзіцячы пакой. На семінарах для бацькоў мы абазначаем асноўныя зоны небяспекі каляровымі стыкерамі і расказваем, як іх можна зрабіць бяспечнымі.

Разам з «боксам бяспекі» радзільны дом атрымаў у падарунак ад арганізатараў праекта высокатэхналагічны відэа-канферэнц-комплекс, які дапаможа палепшыць тэхнічны ўзровень канферэнцый для медработнікаў вобласці.



Будучыя мамы — сама ўвага.

Куткі бяспекі ў падарунак атрымаюць таксама Салігорская і Маладзечанская раённыя бальніцы, Барысаўскі радзільны дом.

Чым тлумачыцца іх неабходнасць? Кожны год у Беларусі гінуць каля 150 дзяцей. Няшчасныя выпадкі, траўмы і атручэнні з'яўляюцца асноўнай прычынай смерці, сярод немаўлят гэта 6,6 працэнта, а сярод дзетак ад года да чатырох — 40 працэнтаў. Прычым шэсць з 10 выпадкаў траўматызму дзяцей ва ўзросце да шасці гадоў можна было б прадухіліць. Сацыяльны праект «Дзеці ў бяспецы» прызваны змяніць сітуацыю ў лепшы бок.

«Нам важна, каб са з'яўленнем дзіцяці ў сям'і ў бацькоў з'яўлялася і адказнасць за іх жыццё і бяспеку. Наша задача змяніць менталітэт людзей, каб яны клапаціліся аб бяспечнай прасторы не пасля атрымання дзіцем траўмы, а да таго. Набыць элементы бяспекі сёння можна амаль ва ўсіх дзіцячых крамах, у тым ліку і праз інтэрнэт-крамы», — дадала кіраўнік праекта.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# УСЁ ВЫРАШАЛАСЯ Б ЛЁГКА, КАЛІ Б... НЕ ЖЫЦЦЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Разумнае і каштоўнае вы будзеце ствараць самі, не я вам данясу светлую думку, якая дапаможа, — адказвае на такія спадзяванні псіхолаг.

Як кажа адзін з **арганізатараў мерапрыемства Міхаіл МАЦКЕВІЧ,** на такіх інтэрактыўных лекцыях нават неабавязкова задаваць пытанні:

— Дастаткова паслухаць размовы і выканаць заданне псіхолага — і адказ, што вам рабіць, часта прыходзіць сам сабой.

Гэтым разам збіраліся пагаварыць аб узаемаадносінах у сям'і. Аднак праз выказванні ўдзельнікаў высветлілася, што многія «пераводзяць» названую тэму ў зону канфліктаў і ў кожнага ёсць свой негатыўны досвед.

Пасля знаёмства прысутныя аб'ядналіся ў групы па некалькі чалавек. Пяццю словамі кожная суполка азначыла, што такое ў іх уяўленні сям'я. У цэлым атрымалася, што гэта **любоў, клопат, адказнасць, шчасце, сумесна праведзены час** і іншыя светлыя паняцці.

— А ці вытрымаюць гэтыя пачуцці, якія склаліся ў такую прыгожую карціну, праверку жыццём і праблемамі? — пацікавілася псіхолаг. — Усё было б добра, калі б... не жыццё.

Крыху пазней спікер пакажа ўдзельнікам, як яны памыляліся, малюючы ў сваіх праектах сямейнае жыццё, якое грунтуецца адно толькі на традыцыйных і правільных каштоўнасцях. Такі падыход



паказвае абмежаванасць прысутных ва ўяўленнях пра бацькоўства і сям'ю. Насамрэч у сям'і павінна быць не толькі светлае і шчаслівае, але і абавязковае, а бацькоўства павінна быць не толькі высокамаральным, але і прагматычным.

## ПАМЫЛІЦЦА І ПАРАЗУМНЕЦЬ

Наступным разам Надзея Аляксандраўна раздае прысутным кейс з «гісторыяй сям'і». Мама, тата, дачка і сын жывуць у доме за горадам. На паўналецце старэйшы атрымлівае ў падарунак кватэру, вучыцца ў інстытуце. Але праз нейкі час даход сям'і змяншаецца, і кватэра часова становіцца сродкам атрымання грошай, а не пражывання сына. Тут надыходзіць паўналецце сястры. Набыць жыллё для яе сродкаў не хапае. Пакрыўджанае дзіця не дае жыцця родным. Бацька гатовы прадаць загарадны дом, дзе яны жывуць, каб і ў малодшай быў уласны куток. Аднак маці катэгарычна супраць. Што рабіць, дзе рашэнне?

— Вы можаце прымяніць названыя вамі асацыяцыі з бацькоўствам да гэтай сітуацыі, — прапануе Надзея Цыркун. — Вось і паглядзім, ці вытрымаюць вашы ідэі праверку жыццём.

Адназначнага і дакладнага рашэння гэтага канфлікту не існуе, прынамсі, так падалося прысутным. Затое ёсць магчымасць паразважаць, у чым паратунак, хто вінаваты, што так адбылося, каму і чым трэба ахвяраваць, дзе памыліліся бацькі... Апошняе — гэта аксіёма: бацькі таксама памыляюцца, але прызнаюць гэта, як правіла, позна.

— Так што ў нашы ўяўленні аб сям'і можна дапісаць словы «мудрасць» і «разважлівасць». Увогуле, пасля ўмяшання жыцця людзі рэзка разумнеюць, праўда, заднім розумам, — каментуе псіхолаг.

Дзеці сёння разбэшчаныя, бо лічаць, што бацькі ім вінны, таму рэакцыя дзяўчыны зразумелая. «І ўвогуле, на што спадзяваліся бацькі?» — абураюцца ўдзельнікі сустрэчы.

— А на што спадзяваліся вы, калі апісвалі сям'ю? — тут жа пытаецца Надзея Аляксандраўна і тлумачыць. — Ніхто з вас не закрануў пытанне, што існуюць правы і абавязкі і бацькоў, і дзяцей. Павінна існаваць зваротная сувязь ад дзяцей да бацькоў. А ў нашай гісторыі бацькі не навучылі дзяцей абавязкам. Увогуле, зразумець, ці добры ты бацька, можна менавіта па гэтай зваротнай сувязі — як дзіця пачне паводзіць сябе ў дачыненні да цябе. Калі сувязь існуе, яе трэба захоўваць, бо спачатку дзіця за табой бегае, увагі шукае, а пасля вы за ім.

## А ВЫ — ХТО?

— Пяць слоў пра сям'ю, з якіх мы пачыналі сустрэчу, — гэта наша першая рэакцыя, нашы пачуцці. Упісваючы іх пасля ў жыццёвую сітуацыю, вы зразумелі, што такія ўяўленні нежыццяздольныя. Аднак гэта не азначае, што мы не мелі рацыі. Давайце вывучым сябе, каб зразумець, да якіх рашэнняў мы больш схільныя, — прапануе псіхолаг і раздае лісткі для праходжання асобаснага тэста.

Яго мэта — дапамагчы прысутным вызначыць, да якога з сямі тыпаў людзей яны адносяцца. (Кіруючыся разуменнем, што сабой уяўляе той ці іншы тып, можна пэўным чынам выхаваць сябе, каб не наламаць дроў у нейкай сітуацыі.)

Пачынаецца разгляд варыянтаў. Генафільны — тып, прадстаўнікі якога выступаюць за каштоўнасці сям'і і захоўваюць генафонд роду. Альтруістычны — яго носьбіты захоўваюць маральныя пачуцці, аднак у прымяненні да бацькоўства ім прыйдзецца абмяжоўваць любоў да знешняга свету і скіроўваць яе ў сям'ю. Гэтыя варыянты прысутныя ацанілі.

А вось эгафільны (асцярожны, здаецца нясмелым, не любіць боль, захоўвае генафонд), даследчыцкі (эксперыментатар і аматар правяраць гіпотэзы), дамінантны (робіць справу для народа), лібертафільны (парушае сувязі, арыентуецца на ўвесь свет, мае схільнасць да пратэсту) і дыгнітафільны (базіруецца на паняццях гонару, годнасці, гордасці) тыпы прысутныя не спадабаліся.

Цяпер час падвесці вынікі і зрабіць высновы. Калі вы не адносіцеся да генафільнага тыпу, то выхоўвайце ў сабе гэтыя якасці. Хоць бы па паўгадзіны ў дзень гуляйце з дзіцем, гаварыце з ім — тады кантакт не знікне і сувязь захаваецца на ўсё жыццё. Амаль усе прысутныя пагадзіліся, што простая думка пра зваротную сувязь з малым — бадай што, самае галоўнае з атрыманага ад сустрэчы, і з дапамогай гэтага можна вырашыць мноства праблем.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## Таццяна ЛЕМЯШЭЎСКАЯ:

# «У НОВЫМ ЖЫЦЦІ СТОЛЬКІ ТАЯМНІЧАГА!»

**Напрыканцы мінулага года маладая беларуская ўрач-акушэр Таццяна Лемяшэўская за распрацоўку і ўкараненне новых метадаў дыягностыкі і медыцынскай прафілактыкі, накіраваных на захаванне здароўя жанчыны, была адзначана міжнароднай прэміяй «Садружнасць дэбютаў» краін СНД. Разам з ёй узнагароду атрымалі яшчэ чацвёра маладых навукоўцаў — з Арменіі, Кыргызстана, Расіі і Узбекістана. Таццяна Лемяшэўская — кандыдат медыцынскіх навук, навуковы супрацоўнік лабараторыі медыцынскай генетыкі і маніторынгу парокаў развіцця Рэспубліканскага РНПЦ «Маці і дзіця». Яе даследчыя работы мелі шырокі рэзананс у галіне рэпрадуктыўнай медыцыны, яна — уладальнік ганаровага для медыкаў медаля імя Ота, актыўна публікуецца ў рэйтынгавых навуковых часопісах, з'яўляецца членам Міжнароднага таварыства ультрагукавой дыягностыкі ў акушэрстве і гінекалогіі (ISUOG).**


Фота Вольгі ХОМЫ.

***— Раскажыце, калі ласка, як адбываўся для вас выбар прафесіі?***

— Медыцыну я выбрала цалкам свядома ў старшых класах гімназіі — мне вельмі хацелася дапамагаць людзям! Раней збіралася быць настаўніцай, як і мая мама, але нечакана сур'ёзна захапілася хіміяй і біялогіяй, была пераможцай рэспубліканскіх этапаў школьных алімпіяд па гэтых прадметах. Паступаючы ў медыцынскі, я здавала ўсяго адзін экзамен — біялогію.

У юнацтве многія з нас максімалісты, і мне напачатку было не важна, якім быць урачом па профілі, галоўнае — што я змагу прыйсці на дапамогу чалавеку, аблегчыць яго пакуты і вярнуць здароўе. Ужо студэнткай медуніверсітэта, калі я ўпершыню прысутнічала пры родах і ўбачыла цуд нараджэння маленькага чалавечка, гэта паўплывала на выбар спецыялізацыі «акушэр-гінеколаг».

> **«Сёння першынца нараджаюць у больш познім узросце, і беларускі тут адпавядаюць еўрапейскім меркам. Напрыклад, летась у Беларусі сярэдні ўзрост жанчыны пры нараджэнні першага дзіцяці быў 27,6 года».**

Я шчаслівая гэтым выбарам. Прырода ўладкавана вельмі мудра, хоць і складана. Новае жыццё — тут столькі таямнічага: і ў момант зараджэння, і пры выношванні. А пачуць першы крык немаўляці заўсёды так хвалююча! Гэта яркія эмоцыі і бясцэнныя моманты. Проста крылы шчасця вырастаюць, калі ўсё добра і ў мамы, і ў нованароджанага!

***— Ці можаце вы сказаць, колькі дзяцей з'явілася на свет пры вашым удзеле?***

— Шчыра кажучы, не думала ніколі пра гэтыя лічбы. За суткі бывае 5—8, а часам і 20 родаў, гэта ж працэс фізіялагічны, тут немагчыма нешта планаваць. Акушэр звычайна памятае першыя ўласна прынятыя роды, як і першую самастойна выкананую аперацыю кесарава сячэння.

Мой стаж у акушэрстве больш за 10 гадоў, магу сказаць адно: нараджэнне новага чалавека — заўсёды вялікая таямніца. Не бывае тут аднолькавых або ўніверсальных схем, немагчыма прадбачыць ні пры адных родах, нават калі яны самыя звычайныя, як усё адбудзецца, як павядзе сябе дзіця. Гэтым акушэрства для ўрача цікавае. Але і непрадказальнае. Правільна ацаніць сітуацыю дапамагаюць вопыт, веды, імгненная рэакцыя. Я сказала б, што акушэрства ў гэтым сэнсе вельмі блізкае да высокага мастацтва.

***— Цэнтр «Маці і дзіця», дзе вы працуеце, галоўная ўстанова Беларусі ў галіне аховы мацярынства і дзяцінства. Гэта для вас больш гонар ці адказнасць?***

— І гонар, і адказнасць. Наш цэнтр мае вышэйшы 4-ы ўзровень аказання медыцынскай дапамогі, да нас людзі звяртаюцца ў самых няпростых сітуацыях. Тут ажыццяўляецца паўнавартасны падыход у лячэнні: ад планавання і вядзення цяжарнасці да родаў і падтрымкі здароўя дзіцяці ў першы год жыцця. Медыкі, якія працуюць у нас, пастаянна прафесійна развіваюцца, папаўняюць свой багаж ведаў. На планёрках мы абавязкова абмяркоўваем самыя нестандартныя сітуацыі з лячэбнай практыкі, з нюансамі дыягнаставання, прызначэннем лекаў і іншае. Гэта вельмі важны абмен думкамі і кампетэнцыяй.

Таксама многія з маіх калег вядуць навуковыя даследаванні, бо матэрыяльна-тэхнічная база РНПЦ дазваляе сёння выконваць навукова-даследчыя работы на самым сучасным узроўні.

> **ФАКТ**
>
> **Беларусь сёння ўваходзіць у першую дзясятку краін свету з самым нізкім узроўнем смяротнасці нованароджаных, паводле інфармацыі з даклада Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ). У нашай краіне на адну тысячу нованароджаных прыпадае 1,5 дзіцячыя смерці. Такі ж паказчык у Нарвегіі і Паўднёвай Карэі.**

***— Як і чаму вы прыйшлі ў навуку?***

— Гэтаму перш за ўсё паспрыяла мая мама. Яна настаўнік-філолаг, як кажуць, педагог ад Бога. Я з ранніх гадоў бачыла, як натхнёна яна працуе, з якім энтузіязмам выкладае свой прадмет, стараецца зацікавіць ім сваіх вучняў. Яе выхаванцы паспяхова выступалі на прадметных алімпіядах, лінгвістычных і літаратурных конкурсах. Мама ўзнагароджана знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь». Хіба гэта не прыклад для мяне?

Дарэчы, таксама мой тата мае званне «Заслужаны работнік транспарту Рэспублікі Беларусь». Таму не дзіўна, што з дзяцінства ў мяне сфарміраваліся высокая адказнасць і творчыя адносіны да прафесіі, патрэба паглыблена займацца прадметам, які з'яўляецца маім «хлебам надзённым».

Першы практычны вопыт у акушэрстве і гінекалогіі я атрымала ў звычайнай жаночай кансультацыі і радзільным аддзяленні адной з мінскіх бальніц. А ўжо потым вырашыла заняцца навуковай дзейнасцю. З гэтай мэтай свядома выбрала для паступлення аспірантуру, а не клінічную ардынатуру.

***— Вы да паступлення ў аспірантуру ўжо мелі сям'ю, маленькае дзіця. Не было сумнення наконт таго, што справіцеся?***

— Мой муж падтрымаў мяне, і я вельмі ўдзячная яму за гэтую падтрымку і за дапамогу ў штодзённым побыце. Шчыра кажучы, навука з'яўляецца нашай агульнай сямейнай каштоўнасцю, нашаму шасцігадоваму сыну звыкла бачыць бацькоў каля камп'ютара, на экране якога схемы і лічбы. Сферы навуковай дзейнасці ў нас таксама блізкія: мой муж Пётр Лемяшэўскі — кандыдат ветэрынарных навук, займаецца праблемамі рэпрадукцыі жывёл і ветэрынарным акушэрствам.

> **«Немагчыма прадбачыць ні пры адных родах, нават калі яны самыя звычайныя, як усё адбудзецца, як павядзе сябе дзіця».**

***— Сёння прыкладам для многіх дзяўчат з'яўляецца вобраз паспяховай дзелавой жанчыны, а не вобраз маці. Статыстыка паведамляе, што ўвогуле не хоча мець дзяцей каля 7 % беларусак...***

— Такая сучасная ўрбаністычная тэндэнцыя, калі на першым месцы ў жанчыны праца, кар'ера, а ўжо потым дзеці. Сёння першынца нараджаюць у больш познім узросце, і беларускі тут адпавядаюць еўрапейскім меркам. Напрыклад, летась у Беларусі сярэдні ўзрост жанчыны пры нараджэнні першага дзіцяці быў 27,6 года.

Але як урач-акушэр я пазначу: пажадана, каб першыя роды адбыліся да 30 гадоў, каб усё прайшло без ускладненняў для дзіцяці і для маці. Не варта свядома адкладваць з'яўленне дзяцей на больш позні тэрмін — прыроду не падманеш. А прыродай жанчына створана перш за ўсё для працягу жыцця, для нараджэння будучых здаровых пакаленняў. З узростам колькасць храмасомных захворванняў і парушэнняў у яе павялічваецца, на жаль, узрост — антаганіст якасці здароўя нашчадкаў.

Нарадзіць здаровае дзіця — самае вялікае шчасце для жанчыны! Гэта абуджае творчую энергію і падахвочвае да новых вышынь. З'яўляюцца і сілы, і цікавасць, і натхненне. Улічваючы асабісты вопыт, я магу так гаварыць.

***— Тэма вашай навуковай працы вельмі актуальная, і не толькі для нашай краіны.***

— Тэма выбіралася калегіяльна, аднак мне адразу спадабалася — і тым, што мае вострую медыцынскую накіраванасць, і тым, што ў ёй, акрамя акушэрства, закранаюцца праблемы генетыкі. Мне прапанавалі заняцца вывучэннем адной з найбольш значных праблем у акушэрстве — узнікненнем у цяжарных прээклампсіі (паталагічнага стану, які суправаджаецца павышэннем крывянога ціску, з'яўленнем ацёкаў і бялку ў мачы. — ***Аўт.***). З навуковым кіраўніком Аксанай Уладзіміраўнай Прыбушэняй, загадчыцай лабараторыі медыцынскай генетыкі і маніторынгу пароку развіцця РНПЦ «Маці і дзіця», мы не былі асабіста знаёмыя. Але ўжо з першых сустрэч і гутарак з ёй я ўбачыла акушэрства з іншага боку. Аксана Уладзіміраўна шмат гадоў займаецца праблемамі медыка-генетычнага кансультавання, ранняга выяўлення спадчынных і прыродажаных захворванняў дзіцяці. Яе вопыт і веды, мае мэтанакіраванасць і захопленасць навукай з'явіліся добрай асновай для выніковасці нашай працы.

Гэта было сапраўды аб'ёмнае навуковае клінічнае даследаванне на працягу пяці гадоў, вельмі складанае, з вялікай колькасцю пацыентаў — назіралася каля 1000 жанчын. Мы вывучалі сур'ёзнае ўскладненне цяжарнасці, якое парушае фарміраванне плацэнты. Гэта небяспечна перш за ўсё для самой жанчыны, з'яўляецца непасрэднай пагрозай яе жыццю. Спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя пазначаюць гэтае захворванне ў ліку трох асноўных прычын мацярынскай смяротнасці ва ўсім свеце.

> **«Пачуць першы крык немаўляці заўсёды так хвалююча! Гэта яркія эмоцыі і бясцэнныя моманты. Проста крылы шчасця вырастаюць, калі ўсё добра і ў мамы, і ў нованароджанага!»**

***— Напэўна, вельмі важна, што вынік вашай працы мае не толькі тэарэтычнае значэнне.***

— Так, гэта мой асаблівы гонар. Мае даследаванні атрымалі добрыя водгукі ў практыкуючых спецыялістаў, а таксама ў навуковай супольнасці. На міжнароднай канферэнцыі «Рэпрадуктыўная медыцына: погляд маладых», якая адбылася ў Пецярбургу, мая работа была адабраная навуковым камітэтам для вуснага даклада, а па выніку прызнаная найлепшай. За вялікі практычны і фундаментальны ўклад яна адзначана памятным медалём імя славутага акушэра Д. Ота. Асабліва прыемна было пачуць пахвалу і станоўчае меркаванне ад акадэміка РАН, доктара медыцынскіх навук, прафесара Эдуарда Карпавіча Айламазяна — аўтарытэтнага спецыяліста ў галіне акушэрства і гінекалогіі, па яго падручніку "Акушэрства" вучацца студэнты нашых медыцынскіх ВНУ.

Таксама запомніўся Сусветны кангрэс па медыцыне плода (FMF). Для мяне гэта быў вельмі важны вопыт — удзел у шырокай адукацыйнай праграме, дыскусіі і асабістае знаёмства з такімі вядомымі асобамі, як Раберта Рамэра, доктар медыцынскіх навук, кіраўнік аддзялення перынаталогіі Нацыянальнага інстытута здароўя ЗША. Словам, наперадзе шмат работы, але гэта не палохае, а, наадварот, натхняе.

**Алена ЦЯРЭНЦЬЕВА.**

## Нататкі шматдзетнага таткі



# Сімпатычны бандыт

Паказаў сыну сваю фотагалерэю з дзевяностых. Ён здзівіўся і кажа:

— Ты што, быў бандытам?!

— З чаго ты ўзяў?

— У вас твары як з фільмаў пра бандытаў.

— Тады ва ўсіх такія твары былі.

— Чаму?

— Час быў такі, «Фэйсбука» не было.

Сын паважліва:

— Добра, што цяпер ён у цябе ёсць.

Старэйшая дачка, гледзячы на тыя ж фота:

— Жах... Ну і морды...

Потым, спахапіўшыся:

— Але ўсё роўна, татачка, ты тут самы сімпатычны.

Усё-такі наколькі больш прыемна мець справу з дзяўчаткамі: яны нават там, дзе ўсё дрэнна, знойдуць штосьці добрае і цябе пашкадуюць.

* * *

Поля з раніцы ўстала — вакол вока чырвоным фламастарам намаляваны круг. Пытаю яе:

— Гэта што яшчэ такое?

— Проста Ксенія мяне будзіла, я не хацела прачынацца, і яна мне вырашыла намаляваць вока, як быццам я не сплю.

Здрыгануўся ад думкі, што сёння мяне таксама маглі будзіць такім вытанчаным спосабам. Нават на ўсякі выпадак паглядзеўся ў люстэрка: ці не намалявалі на мне нічога, пакуль я спаў.

Увогуле, калі вы аднойчы ўбачыце ў мяне вакол вока яшчэ адно вока, не пужайцеся: гэта значыць, што я проста хацеў даўжэй пакачацца ў ложку.

***P. S.*** *А пакуль сказаў старэйшым дзецям прыбраць далей іх цыркулі. Раптам фламастара акажацца недастаткова, каб мяне разбудзіць. Сплю ж я моцна.*

* * *

Сяджу на кухні, дзеці ў сваіх пакоях робяць урокі. Раптам чую, хтосьці з малодшых крычыць:

— Тата, а дваццаць тры мінус сем будзе шаснаццаць?

Крычу ў адказ:

— А ты як думаеш?

— Думаю, што не.

— Чаму?

— Не ведаю.

— А я думаю, што так.

— Дзякуй!

Праз тры хвіліны зноў крык:

— Тата, а дваццаць тры мінус сем будзе шаснаццаць?

Я *(раздражнёна)*:

— Вы ж мяне толькі што аб гэтым пыталі!

— Гэта Поля пыталася, а я Вера.

— Ну дык спытай у Полі, яна ведае.

— Нам настаўніца не дазваляе адно аднаму падказваць.

(Трэба ж, якія правільныя, усё павінны зрабіць самі!)

Давялося паўтарыць і для Веры таксама — толькі б настаўніца была задаволена.

***P. S.*** *Цяпер вось сяджу і думаю: а дваццаць тры мінус сем дакладна шаснаццаць будзе? І самае крыўднае — спытаць няма ў каго: сын з ліцэя яшчэ не прыйшоў.*

**Павел ХОЛАД.**

## Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ:

# «ЖАНЧЫНЫ ПАДОБНЫЯ НА ПТУШАК»

**Мужчыны і жанчыны... Мы такія розныя, што часам сцяна паміж намі здаецца непераадольнай. Але ці так гэта? Бо сучасныя мужчыны гэтак жа, як і жанчыны, імкнуцца да ўзаемапаразумення. У пошуках праўды і мужчынскага пункту гледжання «Алеся» сустрэлася з Аляксандрам Вінчэўскім, біёлагам і арнітолагам, дырэктарам грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Аляксандр падзяліўся думкамі пра тое, што ёсць каханне з заалагічнага пункту гледжання, чаму некаторыя мужчыны аспрэчваюць фемінізм і ці ў кожнай пары патрэбна роўнасць.**



**Аляксандр Яўгенавіч ВІНЧЭЎСКІ, дырэктар грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», у мінулым — тэматычны каардынатар прыродаахоўных праектаў ПРААН у Беларусі, аўтар папулярных выданняў аб прыродзе для дзяцей.**

***— На што ў першую чаргу звяртае ўвагу мужчына пры знаёмстве з жанчынай?***

— На знешні выгляд, вядома. Але ўвогуле для характарыстыкі жанчыны і таго, чым яна запомніцца пасля, гэта амаль не важна. А вось характар абавязкова ствараe ўражанне.

Калі вылучаць дробязі, то мой погляд чамусьці заўсёды чапляецца за бровы. Па іх можна сказаць, як жанчына даглядае сябе. У дзяцінстве і юнацтве я лічыў, што вышчыпваць бровы — гэта лішняе. А цяпер звяртаю ўвагу на гэта. У кагосьці бровы занадта тоўстыя, у кагосьці занадта тонкія, некаторыя дамы ўвогуле ўсё выскубаюць і малююць новыя. Мне здаецца, па бровах можна ацаніць густ жанчыны.

***— Ці можна вылучыць тры якасці «сапраўднай жанчыны»?***

— Гэта было б па-сексісцку. І хто ў такім выпадку «несапраўдная» жанчына? Мне здаецца, станоўчыя якасці мужчын і жанчын не павінны адрознівацца. Я магу назваць тры якасці ў людзях, якія мне падабаюцца: добразычлівасць, вера ў сябе, пачуццё гумару.

***— Што такое жаночая логіка?***

— Гэта інтуітыўная логіка. Але я не кажу, што яна нейкая няправільная. Калі мы, мужчыны, робім высновы на падставе фактараў, якія можам ацаніць, то жанчыны падсвядома ўлічваюць тыя рэчы, якіх мы не бачым ці не сычтваем. У іх мультыфактарнае мысленне, і яны шматзадачныя. Фізіялагічна мозг жанчын уладкаваны па-іншаму, таму некаторыя моманты яны ўлічваюць, нават не ўсведамляючы гэтага. Але я разважаю зыходзячы са свайго досведу, бо мужчыны, як і жанчыны, бываюць розныя.

***— Пра што марыць кожны мужчына?***

— У кожным узросце мараць пра рознае. Пакуль няма жонкі — сустрэць такую жанчыну, якая магла б ёю стаць. Калі ёсць жонка і дзеці — пакінуць пасля сябе на Зямлі добры след.

Прынамсі, я імкнуся накіраваць свае намаганні на тое, каб захаваць планету і прыроду Беларусі па максімуме. Інакш навошта жыць? Зарабіць грошай і патраціць іх на новы дом, машыны, паездкі? Калі чалавек мае толькі такія мэты — гэта сумна.

***— Жанчыны падобныя на...***

— Наогул, мне здаецца, яны падобныя на птушак. Яны ўпрыгожваюць наша жыццё, адзяваюцца лепш за нас, галасы ў іх больш высокія, і, як правіла, жанчыны больш узвышаныя і мяккія. Я працаваў у розных арганізацыях і зразумеў, што не хацеў бы працаваць у выключна жаночым або выключна мужчынскім калектыве. Змешаны тып арганізацыі — ідэальны.

***— Чаму жанчыны так часта плачуць?***

— Таму што яны не хаваюць слёз. А некаторыя нават маніпулююць з іх дапамогай — гэта сумна, але такое ёсць.

Мужчыны трымаюць сябе ў руках, але гэта не значыць, што яны чэрствыя. Мяне, напрыклад, даволі лёгка расчуліць. Але так, каб пакрыўдзілі і я заплакаў, — не, такога не памятаю...

***— Каханне існуе?***

— Без сумнення. І нават магу сцвярджаць, што ў жывёл яно таксама ёсць: і на ўсё жыццё, і часовае. Яны сапраўды гэтак жа пакутуюць ад кахання. Так што ў каханні паміж людзьмі сумнявацца ўвогуле не прыходзіцца.

***— А што такое каханне?***

— Ведаеце, я шмат хадзіў па лясах і балотах і не заўсёды думаў на біялагічныя тэмы. Думкі аб паводзінах жывёл мяжуюць з аналогіямі сярод людзей. І я прыйшоў да высновы, што, калі людзі ўлюбляюцца ў сваіх куміраў (спевакоў, акцёраў і інш.), — гэта больш біялагічнае каханне. Калі казаць пра яго з заалагічнага пункту гледжання, то, напрыклад, ёсць прывабныя альфа-самцы, да якіх падсвядома цягнуцца самкі. Чым часцей і гучней спявае, напрыклад, самец салаўя, тым ён больш прывабны для самак.

Але ў людзей з'яўляецца яшчэ адзін фактар. Каханне мужчыны і жанчыны, любоў бацькоў і дзяцей — ці ёсць нешта агульнае паміж імі? Так. Давер. Дзіця даверае бацькам, жанчына — мужчыну, і наадварот. У той момант, калі людзі ў пары пачынаюць ва ўсім даверацц адно аднаму — і ў патаемным, і ў звычайным, — зараджаецца менавіта гэтае глыбокае каханне

Людзі разводзяцца, калі гэты давер губляецца. Толькі з-за гэтага...

***— Ад чаго вы змаглі б адмовіцца дзеля кахання?***

— Аднойчы я адмовіўся дзеля кахання ад кар'еры. У свой час мне прапанавалі пасаду ў еўрапейскім офісе BirdLife International, міжнароднай арганізацыі па абароне дзікай прыроды. Калі паўстала пытанне аб пераездзе ў Брусель, дзеці яшчэ вучыліся ў школе, і яны не захацелі яе мяняць. А мы з жонкай, вядома, не хацелі іх прымушаць. Жонка казала, каб я ехаў, што мы зможам мець зносіны на адлегласці. Але я зразумеў, што, калі паеду, страчу сям'ю.

Зараз я гляджу на калег, якія раз'язджаюцца дзеля кар'еры. Яны не разрываюць сем'яў, проста жывуць у розных краінах, сустракаюцца з рознай рэгулярнасцю. Можа, у іх любоў нейкай страшнай сілы, якая дазваляе ім быць адно ад аднаго на адлегласці столькі часу?

***— Калі жанчына зарабляе больш...***

— Выдатна! Значыць, мужу пашанцавала. *(Смяецца.)* Не бачу нічога дрэннага. Вядома, калі мужчына будзе атрымліваць 200 рублёў і не змога пражыць без дапамогі жонкі — гэта ненармальна. А калі наадварот? Такая сітуацыя для нас традыцыйная, бо, калі ў сям'і маленькія дзеці, па-іншаму быць не можа: жанчына дома з дзецьмі... Многае залежыць ад таго, як пара фарміруе бюджэт. У мяне цяпер жонка зарабляе больш. Але ў нас няма ніякіх неладоў з гэтай нагоды. Яна ж мяне не ўтрымлівае, і нас усё задавальняе.

***— Хто ў сям'і галоўны?***

— У нашай сям'і жонка кажа, што я галоўны, а я лічу, што мы на роўных і вырашаем усё разам.

Мне здаецца, гэтыя пытанні залежаць ад канкрэтнай сям'і і канкрэтных мужчыны і жанчыны. Часам ім нельга быць на роўных, таму што бываюць жанчыны-лідары і мужчыны-лідары. Я ведаю сем'і, дзе жанчына — лідар і мужчына ад гэтага проста шчаслівы.

Галоўны чалавек у сям'і павінен браць на сябе адказнасць. Не толькі нешта самастойна, не раячыся, вырашаць, але і ў выпадку чаго адказваць за свае памылкі. Мы з жонкай дзелім адказнасць напалам, пакуль праблем з гэтым не было. У большасці пытанняў, якія трэба было вырашаць, атрымлівалася знайсці кансэнсус. У нас так, таму што мы прыкладна аднолькавай кампетэнцыі, аднолькавага сацыяльнага пласта, падобных поглядаў. Але наша роўнасць — гэта не ідэал, да якога трэба імкнуцца, таму што для кожнай сям'і ўсё індывідуальна.

***— Вы абараняеце рэдкія віды птушак, а ці трэба абараняць жанчын ад чагосьці? Бо кажуць, што жанчына — слабы пол...***

— Жанчын трэба абараняць, як і мужчын, як і дзяцей. Гэта значыць, трэба абараняць усіх, хто несправядліва пакутуе. Я б не рабіў фокусу на жанчынах. Пра тое, што яны слабы пол, кажуць традыцыйна. Ёсць жа такія, што мацнейшыя за ўсіх мужчын! Але калі разглядаць жанчын як сацыяльную групу, важна абараняць іх ад дыскрымінацыі і гвалту.

***— Як вы ставіцеся да фемінізму? Многія мужчыны крывяцца, пачуўшы гэтае слова.***

— Стаўлюся вельмі станоўча, бо гэта барацьба за роўныя правы. Я лічу сябе феміністам. І я скажу, чаму мужчыны крывяцца. Па-першае, яны не ведаюць дакладнага азначэння. Я сам здзівіўся, калі прачытаў пра роўныя правы. А па-другое, курчыць ад псеўдафемінізму. Таму што гэтага зараз вельмі шмат. Многія жанчыны думаюць, што фемінізм — гэта імкненне да таго, каб у іх было больш правоў, чым у мужчын. А сапраўдны сэнс — у разумнай роўнасці. Таму мне падаецца важным, каб было больш жанчын на кіруючых пасадах, бо ў жанчын іншы погляд на свет.

***— Як зрабіць так, каб адно сіны не астылі?***

— Абдымацца і цалавацца кожны дзень. У мяне ў сям'і менавіта так. *(Усміхаецца.)*

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**

**Фота з сямейнага альбома Аляксандра ВІНЧЭЎСКАГА.**



# «З ТРЫМА ДЗЕЦЬМІ МОЖА СПРАВІЦЦА КОЖНАЯ ПАРА»



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Дочкам кажу: першым чынам — сям'я, а пасля ўсё астатняе. У мяне менавіта так і атрымалася. Рабіць стаўку толькі на кар'ерны рост, намерана адмаўляючыся ад астатніх сфер жыцця, не варта.

Я сапраўды лічу, што паколькі мы жанчыны, то і першае, што мы павінны зрабіць на гэтай зямлі, — гэта нарадзіць дзяцей! Дзеці — самае найлепшае. Не кожная з нас гэта да канца разумее.

***— Вы працуеце старшым пракурорам упраўлення Генеральнай пракуратуры па наглядзе за выкананнем заканадаўства на транспарце і ў мытных органах Генпракуратуры. Такая пасада, безумоўна, патрабуе цвёрдасці характару. А дома дзеці: там трэба быць ласкавай матуляй. Як знаходзіце баланс?***

— Па вялікім рахунку я «белая і пушыстая», аднак у любы момант магу расставіць усе кропкі над «і», калі гэтага патрабуе сітуацыя. Важна ўмець ставіцца да людзей з разуменнем, але не патураць кожнаму капрызу. На працы ўсё проста: ёсць патрабаванні заканадаўства, у межах якіх мы дзейнічаем.

Многія думаюць, што жанчыны ў нашай прафесіі чарсцвеюць. Але гэта не так. Кожная з нас прыгожая душой і сэрцам, проста прафесія ў нас адказная і патрабуе знешняй і ўнутранай сур'ёзнасці.

***— Вечнае пытанне да шматдзетных матуль, якія працуюць: як усё паспяваць?***

— Пра гэта ў мяне запытваюцца ўсе мае сяброўкі і нават калегі па працы. Сакрэт у добра спланаваным распарадку дня. Я і сама раней не ведала, колькі можна паспець за суткі, калі ўсё загадзя прадугледзець. Возьмем нядаўні выхадны: у 9 раніцы мы былі ў аквапарку, у гадзіну ўжо знаходзіліся на модным паказе, дзе дэфіліравалі нашыя дзяўчаткі, увечары яшчэ і ў госці з'ездзілі. Ніякіх дзённікаў не вяду і нічога не запісваю — усё трымаю ў галаве.

Я імкнуся ў кожным дне знаходзіць нешта пазітыўнае. Радуюся сонцу, добрым навінам, прыемным словам. І дзецям сваім заўсёды гавару: радуйся кожнаму дню, рабі па магчымасці ўсё найлепшым чынам. Калі што-небудзь паправіць не ў тваіх сілах, не трэба расстройвацца.

***— Ёсць думка, быццам чым больш дзяцей, тым прасцей іх выхоўваць. Праўда?***

— Тацціяне зараз ужо 14, Кацярыне — 12 і сыну Аляксандру — 10 гадоў. Першае дзіця дае табе новы досвед. Калі нараджаецца другое ці трэцяе, ты, здаецца, ужо і ведаеш, чаго чакаць. Але лягчэй усё роўна не становіцца. Усе дзеці маюць свой непаўторны характар, тэмперамент. Калі ў дзяцей маленькая розніца ва ўзросце, першыя два-тры гады маці няпроста, але дзецям ніколі не бывае сумна. Яны заўсёды гулялі разам, прыдумвалі розныя забавы. І цяпер яны добра паміж сабой ладзяць.

Думаю, з трыма можа справіцца кожная пара. Гэта няпроста, але рэальна. Трэба любіць дзяцей, яны павінны быць жаданымі. Але спланаваць усё ў гэтай сферы дакладна не атрымаецца, ды і навошта?

***— Мы жывем у час інфармацыйнага грамадства. Шматлікія эксперты, блогеры і доктары па ТБ, у прэсе і праз сацсеткі вучаць «уменню быць мамай». Прычым многія даказваюць абсалютна супрацьлеглыя думкі. Як не згубіцца ў інфармацыйнай плыні?***

— Калі рыхтавалася стаць мамай упершыню (а было гэта на пачатку 2000-х), інтэрнэт яшчэ не ўвайшоў у наша жыццё. Затое літаратуры для будучых бацькоў хапала. Кніг тады я прачытала шмат і першым часам нават спрабавала прытрымлівацца пэўных парад. Але ў працэсе зразумела, што многае з напісанага не мае нічога агульнага з рэальным жыццём. Лічу, што трэба валодаць інфармацыяй, аднак не «губляць галаву» і дзейнічаць па абставінах.

***— Самая важная думка, якая прыйшла да вас з нараджэннем дзяцей?***

— Дзеці — гэта наша шчасце, нашы нашчадкі, наш працяг, нават у дробязях. Бывае, гляджу на іх і заўважаю ў пэўных звычках ці рысах сябе ці мужа. Яны не бачылі, разумеюць, што трэба рабіць, і нават могуць маніпуляваць такім чынам бацькамі.

Мы з мужам дамовіліся, што збольшага дзецьмі буду займацца я. У мяне і магчымасць была, калі што, скарэктараваць працоўны дзень, выйсці на бальнічны. Ён мужчына і са сваёй прафесіяй такога дазволіць сабе не можа. Паколькі дзеці мяне бачаць часцей, то ў нашай сям'і я гэткая «Бабка Ёжка». *(Усміхаецца.)* Больш строгая і патрабавальная. Калі нарадзіўся Саша, муж тры гады працаваў пракурорам у Гомелі. Ён прыязджаў дадому толькі на выхадныя. Калі б не дысцыпліна і строгі парадак, якія панавалі ў той час у нашым доме, то мне было б вельмі цяжка.

***— Не магу не адзначыць, што выглядаеце вы шыкоўна! Зусім не падобныя на стэрэатыпны вобраз шматдзетнай маці: стомленай жанчыны, якая махнула рукой на прыгажосць.***




Фота Андрэя САЗОНАВА.

Пераможцы конкурсу «Жанчына года — 2018» у намінацыі «Мацярынская слава». Юлія ТРЫКОЗА другая злева.

— Але я таксама бываю стомленай! Магу прыйсці з працы і папрасіць у дзяцей «гадзінку цішыні». Яны ўжо падраслі і разумеюць. Немагчыма ўвесь час знаходзіцца на ўздыме, нешта не атрымліваецца і можа ісці не так, як хочацца. У такія моманты я зачыняюся ў пакоі, бяру кніжку ці ўключаю добры фільм.

А наконт жаночага хараства... Колькі б дзяцей ні было, нельга забываць, хто мы ёсць. Жанчына павінна заўсёды выглядаць прыгожа. Я нават падчас дэкрэту старалася быць прывабнай, мне самой падабаецца, калі я выглядаю добра. Каб гэтага



як мы ў свой час нешта рабілі, але зараз падрастаюць і паступаюць такім жа чынам.

Таму так важна выхоўваць не словам, а справай. Мы вядзём актыўнае жыццё: ходзім у кіно, займаемся спортам, выязджаем за горад, імкнёмся правесці водпуск на моры. Думаю, што свае сем'і дзеці будуць будаваць па нашым прыкладзе. Усё тое, што ўпітаюць зараз, перададуць нашым унукам.

***— Адна з прычын канфліктаў у беларускіх сем'ях — розныя погляды партнёраў на выхаванне дзяцей. Як пары дасягнуць кампрамісу ў гэтым пытанні?***

— З самага пачатку абмяркоўваць сваё бачанне выхавання. Паміж бацькамі павінен быць поўны давер. Нельга дапусціць сітуацый, калі тата забараняе нешта, а мама дазваляе, ці наадварот. Гэта падрывае аўтарытэт аднаго з бацькоў у вачах дзяцей. Яны не дасягнуць, я займаюся спортам: плаваю, хаджу ў спартзалу. Хочацца быць прыгожай не толькі для мужа і дзяцей, але і для ўласнай упэўненасці.

***— Юлія, аб чым марыце?***

— Ёсць у нас з Уладзіславам адна даўняя-даўняя мара — адправіцца куды-небудзь удвух хоць на тыдзень. У нас не было вясельнага падарожжа: спачатку на працы не адпускалі, а з нараджэннем дзяцей было ўжо не да гэтага. Але мы не пакідаем планаў, проста адклалі іх на няпэўны час. Пакуль у нас ёсць адна вясёлая кампанія, без якой немагчыма ўявіць адпачынак. Вось станучь нашы Таня, Каця і Саша больш самастойнымі, тады мы і здзейснім сваю рамантычную вандроўку.

**Ганна КУРАК,**
**фота з архіва сям'і ТРЫКОЗАЎ.**

---

Асабістае

# ЯКАЯ ТЫ, АДЗІНОТА?

— Знік мой гузік! Згубіўся! Не магу нідзе яго знайсці! — жаліцца бабуля, заходзячы ў ардынатарскую.

— Які гузік? Чаму вы так з-за яго перажываеце? Зараз пашукаем яго разам, — спрабую як псіхолаг суцешыць бабулю і адначасова ўдакладніць, што ж насамрэч здарылася.

— Ой, не знойдзем! Я ўжо ўсё абшукала! Яго нідзе няма! — плача яна.

— Ён такі каштоўны? Можа, старажытны? А дзе ж ён быў? На вашай сукенцы ці на кофтачцы? — распытваю я.

— Не, не на сукенцы! У скрыначцы! Ён — звычайны! Але я ж яго карміла! Я ж яго даглядала! — не супакойваецца бабуля.

— Як карміла? Каго? Гузік?! — мне робіцца не па сабе. Чысценькая, ахайная, разважлівая, цалкам адэкватная бабуля — і раптам такое!

— Я на нітачку яго падвешвала і маятнік рабіла! Ну, вы ж разумееце, пра што я кажу, — тлумачыць бабуля.

— А-а-а... І навошта вам маятнік?

— А я ў яго пыталася, ці прыйдзе да мяне валанцёрка Оля! — паведамляе бабуля.

Дзякуй богу, гузік стараннямі медсёстраў дый іншых супрацоўнікаў бальніцы неўзабаве знаходзіцца. Бабуля адразу ж супакойваецца і весялее. А валанцёрка Оля ў той дзень не прыходзіць. Яна і так даволі часта наведвае бальніцу, нягледзячы на тое, што ў яе — свая сям'я, адказная праца, ужо не малადыя бацькі, іншыя справы...

Самадастатковых людзей сталага веку ў нашай краіне і ў наш час — адзінкі. Адсутнасць самадастатковасці часта прыводзіць да вялізных праблем: чалавек, які нічым не заняты, пачынае патрабаваць да сябе падвышанай увагі сваякоў, медперсаналу, валанцёраў, бо ён не ў стане застацца сам-насам з сабой.

Але ні сваякі, ні медыкі, ні валанцёры, ні псіхолагі пры ўсім іх жаданні не могуць удзяліць такому чалавеку столькі ўвагі, колькі ён патрабуе. Чалавек пакутуе, хваробы прагрэсуюць.

У той жа час павялічваецца колькасць маладых людзей, якія з задавальненнем застаюцца сам-насам са сваім улюбёным камп'ютарам, і больш ім ніхто і нішто непатрэбна, нават жаданне апынуцца за межамі ўласнай кватэры ў іх адсутнічае.

Не, гэта не тыя маладыя людзі, якія захварэлі на залежнасць ад камп'ютарных гульняў і сацыяльных сетак і для якіх адзінай слушнай будзе парада як мага хутчэй звярнуцца па дапамогу да псіхолага або ўрача-псіхатэрапеўта.

Маладыя людзі, пра якіх я кажу, працуюць за камп'ютарам, заказваюць па камп'ютары неабходныя харчовыя і прамысловыя тавары, там жа знаходзяць сабе сяброў, а потым, таксама па камп'ютары, пытаюцца ў псіхолагаў, ці нармальны лад жыцця яны вядуць, калі... не выходзяць з кватэры па некалькі тыдняў? І ці ўсё з імі ў парадку, калі такі лад жыцця іх цалкам задавальняе?

...Час знаходжання бабулі ў бальніцы падыходзіць да завяршэння, а яна зусім не хоча вяртацца дамоў, дзе ёй даводзецца цэлымі днямі быць адной «на ўсім гатовым». Яна марыць аб інтэрнаце, але клапатлівыя і любячыя сваякі ніколі не наважацца зрабіць такі крок. І таму дзень выпіскі з бальніцы, які, здавалася б, мусіць быць для чалавека вельмі радасным, для некаторых пацыентаў становіцца, як ні дзіўна, даволі сумным.

Згадваю і яшчэ адну вельмі прыемную, сімпатычную пажылую жанчыну, якая, нягледзячы на зусім дрэнны зрок, увесь час чытала кніжкі. «Я не хачу думаць аб мінулым, таму і чытаю іх адну за адной», — казала яна.

Была і іншая, якая, наадварот, успамінала сваё мінулае з вялікай удзячнасцю, і хоць жыццё ў яе было зусім не лёгкае, яна не пачувалася самотнай. Можна толькі парадавацца за такіх людзей і павучыцца ў іх любові да жыцця, напоўненага сэнсам, вераю, служэннем іншым людзям і здольнасцю перамагаць любыя цяжкасці.

**Марына БАБРОЎСКАЯ, псіхолаг.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», расположенного по адресу: г. Орша, ул. Сергея Грицевца, 16

**Лот № 1, состав:** 1. Здание проходной хлебозавода, инв. № 240/С-30357, площадь – 102 кв. м. 2. Здание хлебопекарни, инв. № 240/С-31313, площадь – 1321,9 кв. м. 3. Здание склада хлебозавода, инв. № 240/С-30355, площадь – 241,8 кв. м. 4. Здание мазутонасосной, инв. № 240/С-45934, площадь – 30,8 кв. м. 5. Сооружения в составе инженерных сетей (водопроводная, канализационная, тепловая, электрические сети и ограждения). **Обременение**: аренда части здания хлебопекарни с инв. № 240/С-31313 до 31.03.2019 (площадь – 93,6 кв. м); аренда части здания проходной хлебозавода с инв. № 240/С-30357 до 31.03.2019 (площадь – 102,0 кв. м). **Земельный участок:** кадастровый номер 242400000001005543, площадь – 0,7979 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена** – 161 898,00 **бел. руб. с НДС. Задаток –** 16 189,80 **бел. руб.**

**Лот № 2, состав:** 1. Здание административно-бытового корпуса хлебозавода, инв. № 240/С-30346, площадь – 657,1 кв. м. 2. Тепловая сеть и ограждение. **Земельный участок:** кадастровый номер 223650100001015496, площадь 0,1182 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена – 98 131,00 бел. руб. с НДС. Задаток – 9 813,10 бел. руб.**

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. 2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота (Лотов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи. 3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3 % от цены продажи Лота № 1, 5 % от цены продажи Лота № 2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

**Аукцион состоится 23.04.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «ДОРОРС», 220099, г. Минск, ул. Брестская, д. 77, корп. 1, пом. 2, тел. 8 (017) 240-61-79. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (Лот №__), проводимом 23.04.2019 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 19.04.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Коваленко Валентина Алексеевна, тел. 8 044 513-70-55

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытых торгов в форме аукциона на предоставление права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (личинок хирономид)

4 мая 2019 г. в 11.00 в г. Верхнедвинске, ул. Кооперативная, д. 1, (здание райисполкома, первый этаж, каб. 6) состоятся открытые торги в форме аукциона (далее – аукцион) на предоставление права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (личинок хирономид) на территории озера Тятно, площадью 126 га, расположенного в 32 км на северо-восток от г. Верхнедвинска, 2 км на восток от дер. Дубровы, сроком на 5 (пять) лет.

Организатор аукциона – Верхнедвинский районный исполнительный комитет (тел. 8 02151 62130).

Порядок проведения аукциона определен постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699 «Об утверждении Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства».

Согласно заключению Национальной академии наук Беларуси промысловый запас личинок хирономид на озере Тятно составляет 155 кг/га. Предельно допустимый объем изъятия личинок хирономид составит 6250 кг в год.

Начальная цена предмета аукциона составляет 50 базовых величин (1 275,00 белорусского рубля).

Задаток на участие в аукционе составляет 20 % от начальной цены предмета аукциона (255,00 белорусского рубля). Сумма задатка перечисляется на р/с Верхнедвинского райисполкома BY16 AKBB 3604 3130 0069 9210 0000, УНП 300063038, ЦБУ № 206 г. Верхнедвинска, филиал № 216 «АСБ Беларусбанк», г. Полоцк, BIC AKBBBY21216, код платежа 4005.

Аукцион проводится путем пошагового увеличения цены предмета аукциона – 15 %.

К участию в аукционе допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Для участия в аукционе юридическое лицо или индивидуальный предприниматель в сроки, указанные в извещении, подает в комиссию соответствующее заявление, заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении о проведении аукциона, заверенную в установленном порядке копию свидетельства о государственной регистрации юридического лица или индивидуального предпринимателя.

В заявлении указывается, на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам аукциона. Документы принимаются до 30 апреля 2019 г. до 17.00 (рабочие дни с перерывом на обед) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, д. 1 (второй этаж, каб. 25) Верхнедвинский районный исполнительный комитет.

Победителем аукциона будет признано лицо, предложившее наибольшую цену.

Лицам, не выигравшим аукцион, задаток возвращается. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 5 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обязан внести плату за предмет аукциона за минусом внесенного задатка (сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации, необходимой для его проведения).

Адрес и номер контактного телефона комиссии: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, д. 1, Верхнедвинский районный исполнительный комитет (второй этаж, каб. 25, тел. 8 02151 62130)

## УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 25.04.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Котышева П. В.

Легковой хэтчбек «Мазда 626», МКПП, 1998 г. в., дизель, начальной стоимостью 2300 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом). Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

Производственная база: **цех деревообработки с административными помещениями** (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьев. водопровода 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации, очистные сооружения, двухкамерн. септик, поля фильтрации 235 м, покрытия 6446 кв. м; **склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м); **КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м; **ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м); **водозаборная скважина** 615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos;
**насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м, сети пожар. водопровода 484,3 м; **иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га,** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно–быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения – находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60 % от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 09.02.2019**

**Аукцион состоится 16.04.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 12.04.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. **www.cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Пинагрузсервис», г. Пинск, ул. Рокоссовского, д. 2 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Здание склада с пристройками** | Здание многофункциональное | 388,7 кв. м | 130/С-29679 | Брестская обл., **г. Пинск**, ул. Рокоссовского, 2Г |

Составные части и принадлежности: отапливаемая пристройка, четыре пристройки, два ограждения территории, забор металлический, верхнее покрытие территории, двое ворот, наружные сети канализации

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,5693** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания склада с пристройкой. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0302 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 108 322,46 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, должен произвести оплату в течение **5 (пяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **02.04.2019** в 13.00 по адресу: **г. Пинск, ул. Рокоссовского, д. 2, ОАО «Пинагрузсервис»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **01.04.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Настоящим на основании п. 1 ст. 56 Гражданского кодекса Республики Беларусь уведомляем о том, что СООО «БизнесИнвестмент» 28.02.2019 принято решение № 01/2019 об отмене решения от 20.12.2018 № 03/2018 о реорганизации в форме присоединения к нему общества с ограниченной ответственностью «Алавес» (ООО «Алавес»), зарегистрированного Минским городским исполнительным комитетом 01.06.2009 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191117696, адрес местонахождения: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 10, ком. 226а).

УНП 191129277

## Антикризисный управляющий ИООО «Сырьевые ресурсы» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 23.04.2019 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 93А, оф. 404 открытых торгов по продаже:

1. Дебиторской задолженности ИООО «Сырьевые ресурсы»: строительное унитарное предприятие «Строительное управление № 51» (размер задолженности – 9288,73 BYN) – первоначальная цена 8359,86 BYN;

